КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №18 (146)
◂ 22 МАЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА — ПАЛЯК, ЛІТВІН…**

Стар. 15

**НАЦЫЯНАЛІЗМ І ПАТРЫЯТЫЗМ**

Гэта цяжкая тэма. Столькі бруду і лаянкі было выліта за савецкім часам на нацыяналізм і нацыяналістаў…

Стар. 4

**РЫФМАПЛЁТ ЯЕ ВЯЛІКАСЦІ**

Елізавета II прызначыла чарговага паэта, які будзе ўслаўляць яе ў вершах. Упершыню за тры стагоддзі існавання гэтай дзіўнай пасады галоўным паэтам каралеўства стане жанчына.

Стар. 12

**САЮЗ ДЭРУНА І ДРАНІКА**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

## Родная зямля без роднай мовы — чужына

Артыкул старшыні ТБМ Алега Трусава

▸ АД РЭДАКТАРА

# МАЛАДАЯ АПАЗІЦЫЯ

Аляксей КАРОЛЬ

**Вызначальнай рысай зімова-вясновага палітычнага сезону ў Беларусі бясспрэчна з'яўляецца дыялог з Захадам. Які, аднак, не адмяніў вулічных акцый пратэсту. Па традыцыйных датах і, здавалася б, у звыклых формах — мітынг, шэсце, пікет, ланцугі памяці… Нешматлікасць акцый і традыцыйнасць іх фармату далі падставы многім аналітыкам зрабіць высновы пра крызіс вулічнага жанру і крызіс апазіцыі.**

Гэта і так, і не так. Усё адносна. Крызісу жанру няма. Ёсць яго мадыфікацыя пад умовы той палітычнай сцэны, якую сёння ўяўляе сабой Беларусь. З якой немагчыма сысці (акрамя як у эміграцыю, але гэта ўжо сыход у іншы жанр і іншую рэальнасць). І таму рэакцыяй (у многім імпульсіўнай і не да канца асэнсаванай) сталася спроба стварыць на гэтай, дадзенай гісторыяй, беларускай сцэне сваю сцэнічную пляцоўку, каб паўплываць на змены агульнага інтэр'еру і найвышэйшага рэжысёра.

Другая істотная рыса — змена палітычных гульцоў як на галоўных ролях, так і ў масоўцы. Пры захаванні і прысутнасці старых акцёраў — асоб і партый — на палітычную авансцэну выйшла моладзь. Менавіта яна сталася аўтарам, асноўным удзельнікам і арганізатарам зімова-вясновых вулічных інтэрмедый. Нават тых, сцэнары якіх пісаліся сталымі і вядомымі палітыкамі. Прыкладам, сцэнары Дня Волі і Чарнобыльскага шляху, якія рассыпаліся на вачах. Сталыя рэжысёры нейкім чынам апынуліся ў цені, а то і за кулісамі падзей, а на авансцэне ў бубны білі ды шлях да капліцы арганізавалі маладыя.



І ўжо, бясспрэчна, маладым належала ініцыятыва і правядзенне «Марша незалежнасці» 14 мая на Кастрычніцкай плошчы. Гэтак жа, як і ўсіх акцый салідарнасці са зніклымі, з палітзняволенымі. Гэтак жа, як і галадоўкі ў падтрымку Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі. Сталых статусных апазіцыянераў у гэтых акцыях былі заўважаны адзінкі.

Няшмат удзельнікаў? Так — ад 20 да 100 чалавек. Але мала гэта ці многа? І зноў — ні тое, ні другое. Лічбы адэкватныя агульнай палітычнай сітуацыі ў краіне. Не сёння адкрытая заканамернасць: масава на плошчу народ выходзіць у моманты вызначальных палітычных падзей, здольных рэальна змяніць сітуацыю. Таму ў 2006 годзе на «плошчу Каліноўскага» выйшлі дзесяткі тысяч. Адэкватна агульнаму градусу чаканняў грамадства. Узрасце — будзе і 100, і 200 тысяч.

Галоўны сэнс і змест зімова-вясновых акцый, на мой погляд, у іншым. На палітычнай сцэне Беларусі рэальна з'явілася, прычым арганізаваная, маладая апазіцыя. Тое, пра што сумавалі палітыкі і аналітыкі, сталася фактам. Тактыку вулічных акцый моладзь успрыняла ад сталай апазіцыі і не адмовілася ад яе падчас дыялога. І здолела надаць звыклым формам новую канфігурацыю, выключна ў межах прававога поля і ў мірным фармаце.

Сталая ж апазіцыя ці не цалкам зрабіла стаўку на дыялог, забыўшыся пры гэтым выкінуць за борт стары багаж закаснелых супярэчнасцей і сварак — асабістых, між- і ўнутрыпартыйных. У выніку лінія дыялога сталася для яе яшчэ адной лініяй раздробленасці і расколаў. Аляксандр Мілінкевіч абвяшчае пра скліканне Кангрэса праеўрапейскіх сіл. Мікола Статкевіч крыўдуе на яго за плагіят ідэі. АДС праводзіць нараду з намерам выпрацаваць новую тактыку пад новыя ўмовы. Няўжо ідэя Кангрэса дэмакратычных сіл як аб'яднаўчага форума і структуры, калісьці сфармуляваная і рэалізаваная Генадзем Карпенкам, развітальна памахала з мінулага?

Па відавочных для ўсіх фактах дзейнасці, сталая апазіцыя пакінула па-за ўвагай вулічныя акцыі, без якіх аб'ектыўна ва ўмовах аўтарытарнай рэжысуры пад сумнеў падпадае сам факт яе існавання. Бо ў такіх умовах справа ўжо не ў колькасці ўдзельнікаў акцый, а ў дэманстрацыі сваёй рашучасці, сваёй мужнасці, сваёй нескаронасці, сваёй адданасці каштоўнасцям, якімі кляліся. У сваёй непадкупнасці і ўстойлівасці да віруса калабарацыі. Сваёй здольнасці напоўніцу выявіць уласныя магчымасці. Калі б кожная з партый здолела вывесці хаця б актыў на гэтыя акцыі, то замест 20 чалавек было б і 200, і 300…

Менавіта за гэтыя якасці і паважаюць людзі (электарат, калі хочаце) апанентаў аўтарытарных рэжымаў, калі страшна падняцца ва ўвесь рост. Менавіта гэтыя якасці якраз і дэманструе маладая апазіцыя.

Супадзенне ў часе дзвюх палітычных хваляў — дыялогу і вулічных акцый, розных па метадах і канкрэтным напаўненні, але скіраваных на адну мэту — дэмакратызацыю палітычнага жыцця краіны, далі свае, пакуль што прамежкавыя і, на першы погляд, маленькія перамогі. Але ўдумаемся. Сваімі акцыямі моладзь па сутнасці разбурыла некалькі рубяжоў абароны, узведзеных аўтарытарным рэжымам. На месца правядзення акцый — не на плошчы Бангалор, а на Кастрычніцкай. Прымусіла ўлады адмовіцца ад няўхільных, паказальна брутальных разгонаў акцый. Адваявала права на іх правядзенне без папярэдняга дазволу. Адкрыла ўсім, у тым ліку і Захаду, падман уладаў пра адсутнасць у Беларусі палітычнага пераследу і палітычных зняволеных. Узняла хвалю салідарнасці за вызваленне Аўтуховіча з калегамі, арышт якіх чамусьці доўгі час неяк дваіста ўспрымаўся і замоўчваўся як часткай статуснай апазіцыі, так і Захадам. Прымусіла адмовіцца ад масавых выключэнняў навучэнцаў ВНУ за ўдзел у акцыях. І, здаецца, спыніла спробы прымусовага прызыву ў войска актывістаў маладзевага руху. Бо занадта гучны розгалас. Бо прызваныя не схілілі галавы, паводзяць сябе з годнасцю і займелі павагу саслужыўцаў. Бо дзённік Франака Вячоркі становіцца з'явай грамадскага жыцця.

Гэтая кагорта моладзі прымусіла ўлады аслабіць жорсткасць рэпрэсій. Знізіла, хаця б крыху, планку страху ў краіне. Найперш сярод студэнцкай моладзі. Дададзім да гэтай хвалі вулічнага маладзевага руху яшчэ і наяўнасць крэатыўнай пратэстнай маладзевай субкультуры ў розных галінах грамадскага жыцця, і зразумеем, што перамен быць. І не ў рожкі маладых са старымі, а ў супрацы.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГРОДНА. ХРЫСТОС ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў ГАРОДНІ

**У Ноч музеяў гродзенцы пабачылі рок-оперу «Ісус Хрыстос — суперзорка».**

Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, які знаходзіцца ў замкавым комплексе, прадставіў наведвальнікам шматлікія імпрэзы. Кульмінацыяй свята стала рок-опера «Ісус Хрыстос — суперзорка». Сваю версію вядомага мюзікла гледачам паказалі студэнты Гродзенскага педагагічнага каледжа.

### АСТРАВЕЦ. САД – ПРЫШЧЭПКА АД РАДЫЯЦЫІ

**«Сад будзе ісці паперадзе!» — сказаў гендырэктар асацыяцыі «Гроднасадавінагародніна» Віктар Кірэй.**

Згодна яго слоў, каля гарадка для працаўнікоў АЭС ужо ў гэтым годзе будзе пасаджаны сад паўкарлікавых яблынь і груш. Нізкарослась дрэў кіраўнік асацыяцыі тлумачыць тым, што гэта павінна «аблегчыць збор ураджаю». Плануецца, што працу па ўтрыманні сада будуць здзяйсняць жыхары гарадка, якія не змаглі працаўладкавацца на станцыі.

### ПОЛАЦК. ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА

**Суполка «Рубон» Наваполацкай гарадской арганізацыі «Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны» арганізавала творчую сустрэчу.**

Сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў гісторыка-філалагічнага факультэта Полацкага дзяржаўнага універсітэта з рэдактарам літаратурна-мастацкага часопіса «Дзеяслоў», лаўрэатам літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес», пісьменнікам Барысам Пятровічам, старшынёй Саюза беларускіх пісьменнікаў, пісьменнікам і паэтам Алесем Пашкевіча ды вядомым бардам Кастусём Герашчанкам адбылася ў будынку Полацкага кадэцкага корпуса. Госці распавялі пра стан сучаснай беларускай літаратуры, накірункі яе развіцця, яе месца ў сусветным літаратурным жыцці ды чыталі свае творы. Літаратурныя выступы сваімі спевамі аздобіў Кастусь Герашчанка.

Па запрашэнні рэдактара часопіса «Дзеяслоў» Барыса Пятровіча да сустрэчы далучылася адна з арганізатараў сустрэчы, сябра ТБМ, маладая паэтка Ірына Бельская. Студэнты задавалі выступоўцам шматлікія пытанні. Кафедра культуралогіі ПДУ і аўтары самых цікавых пытанняў і атрымалі ў падарунак кнігі і дыскі ад запрошаных гасцей і ТБМ.

### ЛІДА. ГАЛЕРЭЯ ПАРТРЭТАЎ

**Галерэю партрэтаў класікаў і сучаснікаў на працягу 17 гадоў стварае мясцовы мастак Уладзімір Мельнікаў.**

Зараз у ёй каля 50 работ. Яшчэ ў 1995 годзе Мельнікаў напісаў партрэт Маргарэт Тэтчэр і падарыў ёй карціну. Падзяка ад «жалезнай лэдзі» не прымусіла сябе чакаць. Сярод работ мастака партрэты вядомых грамадскіх, культурных і рэлігійных дзеячаў Беларусі: Уладзіміра Мулявіна, Анатоля Ярмоленка, мітрапаліта Філарэта і іншых.

Зараз лідзянін закончыў працу над замовай тутэйшага музея. Па старадаўняму малюнку ён аднавіў вобраз вядомага на мяжы XIX–XX кампазітара, скрыпача-віртуоза Канстанціна Горскага, які нарадзіўся ў Лідзе.

### ГРОДНА. НЕЗВЫЧАЙНАЯ ВЫСТАВА

**У музеі тэлекампаніі «Гродна» адкрылася экспазіцыя старых тэлевізараў.**



Сабраць гэтую калекцыю дапамаглі жыхары рэгіёна, якія прынялі актыўны ўдзел у акцыі «Стары тэлевізар». У студыю паступіла каля 500 тэлефанаванняў. Людзі прапаноўвалі свае рарытэты, якія не адзін дзесятак гадоў знаходзіліся на гарышчы, у гаражах і іншых месцах. Піянера савецкай тэлевізійнай прамысловасці тэлевізар «КВН–49», які быў выраблены ў колькасці 1,3 мільёна, прынёс у музей жыхар абласнога цэнтра Ян Хамко. Гэты апарат важыў 29 кілаграмаў. Яшчэ ў экспазіцыі прадстаўлены «Рубін», «Беларусь», «Зорка» і іншыя тэлепрыёмнікі 1960–1970-х гадоў. А таксама незвычайны экспанат, так званы камбайн, які спалучае ў сабе функцыі тэлевізара, радыёпрыёмніка і прайгравальніка пласцінак.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

---

ЮБІЛЕЙ

# АДЗІН ДЗЕНЬ ПАЛІТВЯЗНЯ

*Генадзь КЕСНЕР*



**20 мая 55-я ўгодкі адзначыла беларуская служба «Радыё Свабода». Гэтай падзеі была прысвечана прэзентацыя кнігі «Адзін дзень палітвязня» аўтарства журналістаў радыёстанцыі — ужо пятнаццатай кнігі серыі «Бібліятэка Свабоды».**

Як адзначаюць укладальнікі, «героі гэтай кнігі — беларускія «зэкі», палітвязні, якім давялося прайсці тое, чаго не пагадзілася перанесці Яна Палякова. Смурод следчых ізалятараў, нары Акрэсціна, шматдзённы этап, адзінота перапоўненай камеры, тупая праца на «хіміі», галадоўкі ў бараках, страчанае здароўе, немагчымасць прыехаць на пахаванне бацькоў, туга па сям'і, бессэнсоўныя касацыі і — нарэшце свабода, дзе ўжо ўсё не так, як было раней, а самае галоўнае — ты сам змяніўся...»

Журналісты «Радыё Свабода» праводзілі адзін дзень у сем'ях палітвязняў, і праз размовы з іх жонкамі, мужамі, бацькамі, дзецьмі, праз лісты вязняў на волю вымалёўвалася сапраўдная карціна, дзе пацярпелым ад рэпрэсій быў не толькі той, хто апынуўся за кратамі, але і ўсе блізкія яму людзі, нават яшчэ ненароджаныя дзеці. Адных палітвязняў вызвалялі, другіх садзілі, і карэспандэнты «Свабоды» працягвалі трымаць гэтую тэму. У выніку ўзнікла ідэя — распавесці калі не пра ўсіх, то прынамсі пра большасць беларускіх палітзняволеных часоў кіравання Аляксандра Лукашэнкі.

Падчас прэзентацыі, якая адбывалася ў амбасадзе ЗША ў Беларусі, да прысутных звярнуліся прэзідэнт «Радыё Свабода» Джэф Гедмін, дырэктар беларускай службы «Свабоды» Алесь Лукашук, часовы паверанны ў справах Злучаных Штатаў Амерыкі ў Беларусі Джонатан Мур, які павіншаваў свабодаўцаў з юбілеем.

Джэф Гедмін распавёў, што прасіў пра сустрэчу з Аляксандрам Лукашэнкам, аднак адміністрацыя беларускага прэзідэнта паведаміла, што кіраўнік дзяржавы заняты да верасня. «Калі я вярнуся ў Прагу, напішу ліст на імя Лукашэнкі, каб гэтую сустрэчу правесці ў верасні», — сказаў прэзідэнт «Свабоды».

Пасля таго, як Алесь Лукашук і ўкладальніца кнігі Ганна Соўсь узгадалі кожнага героя кнігі, а тыя з іх, хто прысутнічаў на прэзентацыі, атрымалі слова, самы вядомы беларускі былы палітзняволены, экскандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін абвясціў пра стварэнне Асацыяцыі палітвязняў.

Сярод тых, хто ўвайшоў у Асацыяцыю і наўпрост на прэзентацыі прагаласаваў за яе стварэнне, — былы прэм'ер Міхаіл Чыгір і экс-міністр сельскай гаспадаркі Васіль Лявонаў, экс-мэр Мінска, экс-міністр знешнеэканамусувязяў і былы пасол Беларусі ў Латвіі Міхаіл Марыніч і экс-дэпутат Вярхоўнага Савета Андрэй Клімаў, журналіст Мікола Маркевіч і праваабаронца Валеры Шчукін, палітыкі Віктар Івашкевіч і Вячаслаў Сіўчык, маладзевыя актывісты Андрэй Кім і Артур Фінькевіч і іншыя вядомыя ў Беларусі і па-за яе межамі асобы.

«Зараз улады рыхтуюць новы закон, які дазволіць сілавым структурам — КДБ, Міністэрству ўнутраных спраў, Камітэту дзяржкантролю — затрымліваць нашых грамадзян без санкцыі пракурора. І мы цудоўна разумеем, што палітычныя рэпрэсіі будуць працягвацца, таму стварэнне Асацыяцыі палітычных вязняў надзвычай неабходна, паколькі вельмі важна, каб голас палітзняволеных, як былых, так і цяперашніх, у тым ліку і Мікалая Аўтуховіча, які зараз галадае за кратамі, быў пачуты ва ўсім свеце», — адзначыў прафесар Аляксандр Казулін.

---

ГАЛАДОЎКА

# АЎТУХОВІЧ ЗНОЎ У ІЗАЛЯТАРЫ

**Ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча вярнулі з турэмнай лякарні ў следчы ізалятар. Пра гэта паведаміў праваабаронца Алег Волчак.**

Паводле яго слоў, пра такое рашэнне паведаміў 20 мая тэрапеўт лякарні падчас традыцыйнага выхаду да сваякоў хворых зняволеных, які праводзіцца кожную сераду. «Лекар заявіў, што яны наогул не ведаюць, навошта Аўтуховіча да іх прыслалі: маўляў, лячыцца ён не хоча, кажа, што адчувае сябе нармальна, ні на што не скардзіцца. А лячыць яго прымусова ніхто не будзе», — перадае словы Волчака БелаПАН.

У турэмную лякарню Аўтуховіч быў дастаўлены толькі 19 мая. Яго адвакат Павел Сапелка пасля сустрэчы з падабаронным патлумачыў, што стан яго здароўя пагоршыўся да той ступені, якая робіць немагчымым яго ўтрыманне ў следчым ізалятары, нават ва ўмовах санчасці следчага ізалятара.

Паводле словаў Сапелкі, Аўтуховіч працягвае галадоўку і мае намер яе спыніць толькі пасля выканання яго патрабаванняў.

Нагадаем, актывісты прадпрымальніцкага руху з Ваўкавыска Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў і Уладзімір Асіпенка былі затрыманы 8 лютага. 18 лютага ім было выстаўлена абвінавачанне на падставе артыкула 218 Крымінальнага кодэкса (наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне маёмасці). Утрымліваюцца яны ў СІЗА № 1 у Мінску.

М. Аўтуховіч абвясціў галадоўку 16 красавіка. Ён патрабуе ў найкарацейшы тэрмін або перадаць справу ў суд, або змяніць усім падследным па гэтай справе меру стрымання з утрымання пад вартай на падпіску аб нявыездзе.

---

ЗМАГАННЕ

# «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ» ВЫСЕЛЯЦЬ

**Вернікаў пратэстанцкай царквы «Новае жыццё» прыгразілі выселіць з будынка пры дапамозе міліцыі. Пра гэта «Еўрарадыё» паведаміў юрыст царквы Сяргей Луканін.**

Прадстаўнікі ЖРЭА Маскоўскага раёна наведалі царкву 19 мая. Яны патрабавалі вызваліць будынак, спасылаючыся на тое, што грошы за яго выплачаны царкве. Аднак пратэстанты адмовіліся пакідаць царкву і патлумачылі, што ўсю суму — 37,5 мільёна рублёў, — яны вярнулі назад на рахунак «Мінгармаёмасці».

Камунальныя чыноўнікі ў адказ прыгразілі прыйсці з судовымі выканаўцамі і міліцыяй. Па словах Сяргея Луканіна, цяпер вернікі ў царкве нясуць пастаянную вахту. «Пра гэта ведаюць таксама і ўлады. У нас там увесь час знаходзяцца людзі, якія нясуць ахову нашага будынка. Але мы больш за ўсё спадзяемся на ахову Божую», — распавёў Луканін.

Нагадаем, Мінгарвыканкам спрабуе выселіць вернікаў «Новага Жыцця» з 2005 года.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ДЗІЎНАЕ СЯБРОЎСТВА З РАСІЯЙ

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Калі ўзгадаць прымаўку пра тое што любыя сварацца — толькі цешацца, то гэта не пра саюз Беларусі і Расіі. На тыдні нашы краіны зноўку «абмяняліся кампліментамі» і выразамі незадаволенасці. Зноў у нас шмат крыўдаў адзін на аднаго.**

Беларусь «занадта доўга рыхтуецца» да прызнання незалежнасці Абхазіі. Такую заяву агучыў спікер Дзярждумы Расіі Барыс Грызлоў 18 мая на брыфінгу ў Сухумі.

Паводле слоў Грызлова, ужо зроблены «пэўныя захады на парламенцкім узроўні, і дэлегацыі парламента Рэспублікі Абхазія нададзены статус пастаяннага назіральніка ў парламенцкім сходзе Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі». Спікер Дзярждумы таксама зазначыў, што абхазская дэлегацыя ўжо ўдзельнічала ў працы другой сесіі, прычым «не толькі назірала, але і раілася, кансультавалася».

«Рашэнне пытання ў першую чаргу залежыць ад прызнання Абхазіі з боку другой саюзнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь. Я размаўляў з калегамі з беларускага парламента, яны гатовы разглядзець гэтае пытанне. І прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка казаў, што, безумоўна, прызнанне будзе. Але мне здаецца, што Беларусь занадта доўга рыхтуецца да гэтага пытання», — заявіў Грызлоў.

На што Грызлову быў дадзены адказ у традыцыйным беларускім стылі: «Мы самі з вусамі, і большымі, чым у вас». «Прызнаваць ці не прызнаваць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі — гэта выключна права Рэспублікі Беларусь. У нас цесныя адносіны з абхазскім і паўднёваасецінскім народамі, якія не патрабуюць пасярэднікаў у чым небудзь аблічы. Беларусы самі прымуць рашэнне. І гэта будзе рашэнне, якое не расколвае наша грамадства», — заявіў старшыня савету рэспублікі Барыс Батура.

Дадаў копаці і беларускі прэм'ер Сяргей Сідорскі. Ён, бачце, занепакоены невыкананнем шэрагу палажэнняў плана сумесных дзеянняў урадаў Беларусі і Расіі па пераадоленні наступстваў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Пра гэта ён заявіў 19 мая на сустрэчы з дзяржсакратаром Саюзнай дзяржавы Паўлам Барадзіным напярэдадні запланаванага на 28 мая ў Мінску пасяджэння саюзнага Саўміна.

«На жаль, эксперты пакуль не знаходзяць варыянты вырашэння тых даручэнняў, якія прэм'еры далі ў мінулы раз, падпісаўшы антыкрызісны план», — заявіў Сідорскі. «Рассельгасбанк» не крэдытуе беларускую тэхніку. Гэта значыць фактычна пастаўкі тэхнікі па прамых дамовах абмежаваны. Ён зазначыў, што з-за ўплыву фінансавага крызісу тавараабарот паменшыўся на 40 працэнтаў і працягвае зніжацца. «Пакуль не адчуваецца замацавання нашых дамоўленасцей на папярэднім саюзным Саўміне. Гэта выклікае занепакоенасць», — заявіў Сідорскі. Паводле слоў прэм'ера, ёсць шэраг пытанняў, вырашэнне якіх беларускі бок хацеў бы актывізаваць. «На двары май, а мы дамаўляліся, што ў першым квартале гэтага года закончым працу па плане сумесных антыкрызісных мерапрыемстваў», — зазначыў ён.

Чым адказала Расія? З 1 ліпеня цана на газ для Беларусі складзе прыкладна 200–205 долараў ЗША за тысячу кубаметраў. Пра гэта паведаміў першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, выступаючы 20 мая на пленарным пасяджэнні ў межах Беларускага прамысловага форуму ў Мінску.

Нагадаем, у разліках кошту газу для Беларусі на 2009 год прадугледжана яго паэтапнае паніжэнне з улікам сусветнага падзення цэн на нафту. Гэта ўрэгулявана дадатковым пагадненнем да кантракта на пастаўку газу ў Беларусь у 2007–2011 гадах, якое «Газпром» і «Белтрансгаз» падпісалі ў пачатку лютага. Але зараз ніякага зніжэння не адбываецца. Дакладная цана, па якой Беларусь купляе газ цяпер, афіцыйна не называецца. Паводле некаторых звестак, гэта прыблізна 147 долараў за тысячу кубаметраў.

Як тут не ўзгадаць «Брыльянтавую руку»: «А калі не будуць браць, — адключым газ!». Да адключэння справа пакуль не дайшла, але з такім перамоўным працэсам да гэтага засталося пару крокаў.

Затое ў чым мы наперадзе ўсяго свету, — дык гэта, як казалі ў СССР, па «гонцы ўзбраенняў». 19 мая ў Мінску адкрылася V Міжнародная выстава ўзбраення і ваеннай тэхнікі Milex–2009. У ёй бяруць удзел 145 экспанентаў з васьмі краін, у тым ліку Беларусі, Расіі, Украіны, Арменіі. На асобным стэндзе працуюць прадстаўнікі ўсіх дзяржаў — сяброў Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бяспецы. Выстава размясцілася на плошчы прыкладна 6 тысяч квадратных метраў.

Адкрываючы Milex–2009, прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі зазначыў, што «выстава можа лічыцца візітнай карткай абароннай прамысловасці краіны і заклікана адыграць значную ролю ў інфармаванні грамадскасці аб магчымасцях абароннага комплексу». Паводле яго слоў, мэта выставы — дэманстрацыя перадавых дасягненняў Беларусі ў галіне распрацоўкі, вытворчасці, рамонту і мадэрнізацыі ваеннай тэхнікі. Прадстаўленыя ўзбраенні, ваенная і спецыяльная тэхніка створаныя на аснове новых інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій, зазначыў прэм'ер.

У цырымоніі адкрыцця выставы таксама ўзялі ўдзел дзяржсакратар Савета бяспекі Беларусі Юрый Жадобін, кіраўнікі беларускіх органаў дзяржкіравання, дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Павел Барадзін, а таксама прадстаўнікі замежных дэлегацый. Дэлегацыю Украіны і Судана ўзначальваюць міністры абароны, Кітая — начальнік галоўнага ўпраўлення ўзбраення і ваеннай тэхнікі НВАК, Азербайджана і ААЭ — начальнікі генеральных штабоў, Ірана, Таджыкістана, Турцыі — намеснікі міністраў абароны. На адкрыцці таксама прысутнічалі прадстаўнікі ваенных ведамстваў Інданезіі, Лівіі, Малайзіі, Амана, Перу, Сірыі і шэрагу іншых дзяржаў.

Такім чынам, нашая ваенная моц будзе прадэманстравана ўсяму свету. Толькі б была ад гэтага нейкая карысць...

Ну і, канешне ж, працягваем гандлявацца з Еўропай. Беларусь можа разгледзець пытанне пра ўвядзенне мараторыя на пакаранне смерцю, лічыць намеснік старшыні камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Анатоль Глаз. Паводле яго слоў, цяпер «можна прапрацаваць заканадаўчыя асновы па ўвядзенні мараторыя на пакаранне смерцю».

Анатоль Глаз падкрэсліў, што станоўчае вырашэнне пытання з увядзеннем мараторыя дазволіць «лягчэй наладжваць» дыялог з дзяржавамі Еўропы. Карацей, аніякага гуманізму — толькі бізнес.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### УЛАДЗІМІР МАКЕЙ

Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей выявіўся не толькі спрытным палітыкам і майстрам кулуарных гульняў, але і настаўнікам чынавенскага апарату. На пасяджэнні калегіі «Аб выніках праверкі працы кіруючых кадраў у дзяржорганах і іншых арганізацыях і мерах па яе ўдасканаленню» спадар Макей адзначыў, што ў сістэме дзяржаўных органаў і арганізацый Беларусі павінны быць у поўнай меры рэалізаваныя патрабаванні прэзідэнта па вылучэнні энергічных кіраўнікоў, якія могуць генераваць новыя ідэі, дзейнічаць не шаблонна, а творча і адказна. Як сапраўдны педагог, чыноўнік не толькі раскрыў перспектывы сваім калегам, але і пажурыў іх для прафілактыкі: «Разам са станоўчымі прыкладамі рэалізацыі патрабаванняў кіраўніка дзяржавы амаль паўсюдна выяўленыя факты фармалізму, пратэкцыянізму, сямейнасці, ігнаравання нарматыўна-прававой базы або неадэкватнага яе ўжывання асобнымі кіраўнікамі і дзяржорганамі». Чыноўнікам, якія хочуць зрабіць кар'еру, варта было б прыслухацца да слоў Макея. Глядзіш, найлепшыя вучні і ў каманду да яго патрапяць.

### ІРЫНА ХАЛІП



Беларуская журналістка Ірына Халіп атрымала прэстыжную ўзнагароду Міжнароднага фонду жанчын у СМІ ў намінацыі «За мужнасць у журналістыцы». Таксама ўзнагароду заваявалі радыёрэпарцёр з Камеруна Агнес Тайе і журналістка з Ірана Джыле Баньягуб.

«Гэтыя надзвычай добрыя журналісткі зрабілі выбар на карысць асвятлення навін у трох краінах, дзе пошук праўды ставіць іх пад пагрозу арышту, фізічнай расправы і нават гібелі, — заявіла старшыня камітэта фонду па прысуджэнні ўзнагарод «За мужнасць у журналістыцы» Джудзі Вудраф. — Нягледзячы на гэта яны няспынна, на працягу многіх гадоў рызыкуючы сваім жыццём і сродкамі да існавання, раскрываючы гісторыі, якія праліваюць святло на жыццё суайчыннікаў і інфармуюць нас усіх».

IWMF паведамляе, што І. Халіп ужо больш за 15 гадоў працуе журналістам у Беларусі, «краіне, дзе становішча журналістаў — адно з самых цяжкіх у свеце». «Яна працавала ў шэрагу газет, якія адна за адной былі закрыты ўрадам. Зараз Ірына працуе ў «Новой газете», адной з самых незалежных газет у краінах былога Савецкага Саюза, дзе таксама працавала Ганна Паліткоўская, якая атрымала ў 2002 годзе ўзнагароду «За мужнасць» і была забіта ў 2006 годзе. Ірына Халіп працуе журналістам і рэдактарам Мінскага бюро расійскай «Новай газеты». Да гэтага журналістка працавала ў шэрагу выданняў Беларусі, некаторыя з іх былі закрытыя ўладамі. Ірыну Халіп у Беларусі неадназова арыштоўвалі і збівалі міліцыянты.

### ЛІДЗІЯ ЯРМОШЫНА



Photo.ByMedia.Net

Гарантам стабільнасці Беларусі на гэтым тыдні з'яўляецца старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. У інтэрв'ю Інтэрфаксу яна заявіла: прапановы па змяненні выбарчага заканадаўства, падрыхтаваныя Цэнтрвыбаркамам разам з экспертамі АБСЕ, не прадугледжваюць кардынальнага перагляду выбарчай сістэмы. «Цягам абмеркавання рэкамендацый, якія вылучыла АБСЕ па выніках мінулых парламенцкі выбараў, экспертамі быў падрыхтаваны кампрамісны варыянт прапановаў па змяненні выбарчага заканадаўства. Падрыхтаваны менавіта прапановы, а не законапраект. Там увогуле няма якіх-небудзь навоўвядзенняў, што мянялі б выбарчую сістэму Беларусі», — адзначыла кіраўніца ЦВК. Паводле яе слоў, прапановы перш за ўсё тычацца правядзення перадвыбарчай агітацыі і фінансавання. Цяпер яны накіраваныя на разгляд міністэрстваў і ведамстваў Беларусі для выпрацоўкі адзінай пазіцыі. На іх аснове можа быць падрыхтаваны законапраект, калі будзе атрымана даручэнне суб'екта заканадаўчай ініцыятывы. «Такога даручэння пакуль няма», — заявіла Ярмошына. Адным словам, на бліжэйшых выбарах беларусы могуць спаць спакойна: нечаканасцяў, што як снег на галаву валяцца электарату іншых краінаў, у нас не прадбачыцца. Ні працэдурных, ні выніковых.

ПАЗІЦЫЯ

# НАЦЫЯНАЛІЗМ І ПАТРЫЯТЫЗМ

**Прафесар Юры ХАДЫКА**

*Мужыцкі Брэйгель трызніць родным краем*
*На вуліцы паміж абжорных крам.*
*О крамы, крамы! Вы душа радзімы.*

*Уладзімір Караткевіч*



Гэта цяжкая тэма. Столькі бруду і лаянкі было выліта за савецкім часам на нацыяналізм і нацыяналістаў, што і сёння ні ў кожнага хопіць смеласці сказаць: я — нацыяналіст. Разам з тым кожны з нас быў патрыётам. Спачатку савецкім, а цяпер беларускім. Патрыётам быць пачэсна. Але ці падзяляе гэтыя паняцці такі высокі бар'ер? І ў чым яго сэнс? Мне здаецца, трэба гэта высветліць ці хаця б падыскутаваць для пачатку.

Звернемся да такой аўтарытэтнай крыніцы, як Вялікая савецкая энцыклапедыя. Цытую яе ў сваім перакладзе і з невялікімі скарачэннямі. «Нацыяналізм — буржуазная ідэалогія і палітыка, а таксама псіхалогія, якая трактуе нацыю як вышэйшую форму грамадскага адзінства, як гарманічнае цэлае з тоеснасцю асноўных інтарэсаў усіх сацыяльных слаёў». І ў падмацаванне прыведзенага вызначэння Вялікая савецкая энцыклапедыя спасылаецца на амерыканскага прафесара Б. Шэйфера, які акрэслівае такія рысы нацыяналізму:

1. Любоў да агульнай зямлі, расы, мовы і гістарычнай (традыцыйнай) культуры;
2. Імкненне да палітычнай незалежнасці і нацыянальнай бяспекі;
3. Містычная адданасць такому сацыяльнаму арганізму, як нацыя, народ;
4. Індывіды жывуць для нацыі;
5. Дадзеная нацыя павінна быць пануючай.

Адносна патрыятызму ВСЭ сцвярджае: «Патрыятызм — любоў да айчыны, адданасць ёй і імкненне служыць яе інтарэсам». І дадае: «Гістарычныя элементы патрыятызму — адданасць роднай зямлі, мове, традыцыям».

Адразу кідаецца ў вочы розніца. Нацыяналізм — ідэалогія, патрыятызм — пачуццё. Больш таго, дзякуючы амерыканскаму прафесару Шэйферу бачна, што пачуццё патрыятызму ўласціва і нацыяналісту (пункт першы), калі пад айчынай разумець агульную зямлю людзей адной расы, мовы і традыцыйнай культуры. Сукупнасць такіх людзей утварае нацыю. Таму імкненне да палітычнай незалежнасці і нацыянальнай бяспекі натуральныя для прыхільнікаў ідэалогіі нацыяналізму.

Становішча зразумела, чаму ў СССР нацыяналізм асуджаўся і пераследаваўся, а патрыятызм ухваляўся і супрацьпастаўляўся нацыяналізму. СССР быў краінай, якую засялялі людзі розных рас, моў і культурных традыцый. Таму аб'яднаць савецкі народ магла толькі любоў да айчыны, пад якой разумелася геаграфічная прастора, акрэсленая дзяржаўнымі межамі. Ход гістарычных падзей паказаў, што такі клей быў занадта слабым, і пры першай нагодзе краіна развалілася на пятнаццаць нацыянальных дзяржаў. Высветлілася, што большую palt ролю меў У. Ленін, калі пісаў пра Расійскую імперыю як пра турму народаў, а не яго наступнікі, якія маскавалі расійскі нацыяналізм савецкім патрыятызмам.

Тут неабходна згадаць пяты пункт прафесара Шэйфера, які кажа пра імкненне дадзенай нацыі да панавання. Гэтую ідэю прафесар запазычыў у ветэрана напалеонаўскіх войнаў па прозвішчы Шавэн. І таму такі нацыяналізм мае ўласную назву — шавінізм. А паколькі пануючай у СССР была руская нацыя, то яе нацыяналізм больш правільна называць рускім шавінізмам. Які і стаў сапраўднай духоўнай прычынай радаснага разбягання саюзных рэспублік, нягледзячы на пэўныя матэрыяльныя страты.

Стаў ён і прычынай міжнацыянальных канфліктаў у постсавецкіх краінах. Характэрна, што латышы і эстонцы не пратэставалі на вуліцах у савецкія часы супраць дзяржаўнай палітыкі русіфікацыі, бо гэта было вельмі небяспечна. А вось сёння руская меншасць бурліва пратэстуе супраць пераносу помніка загінулым савецкім воінам, якія нацыянальныя ўрады лічаць хутчэй сімваламі каланіяльнай залежнасці. Можна не згаджацца з пераносам помнікаў, але відавочна, што гучныя пратэсты рускамоўную меншасць уздымае пачуццё пакрыўджанай нацыянальнай годнасці і памяць пра нядаўняе дамінаванне.

Яны карысныя, бо сведчаць, што адзіная пануючая ідэалогія на прасторах былога СССР стаў гнаны раней нацыяналізм. Нават Беларусь, не разабраўшыся да канца з моўнай праблемай, галасуе «За Беларусь», хварэе за беларускіх спартсменаў і артыстаў і пачынае баяцца аднаўлення СССР.

Нам засталося разабрацца з трэцім і чацвёртым пунктамі прафесара Шэйфера. Прыметнік «містычная» адразу адкінем, бо яго з'яўленне тлумачыцца ўплывам вядомага правадыра нямецкіх нацыянал-сацыялістаў, які вельмі любіў містыку. Будзем разглядаць папросту «адданасць такому сацыяльнаму арганізму, як нацыя, народ» і «жыццё індывідуума для нацыі». Гэтыя тэзы сведчаць, што нацыяналізм ёсць ідэалогія калектывісцкага тыпу. Як сацыялізм і камунізм.

Ад апошніх ён адрозніваецца толькі тым, што не прызнае адкрытай Каралам Марксам класавай барацьбы і непазбежнасці перамогі партыі пралетарыяту. Нацыяналізм за гарманічнае грамадства з вертыкальнай рухомасцю і канкурэнцыяй, але без экспрапрыяцыі і ліквідацыі ворагаў народа. Як сказаў бы ПП РБ, нацыяналізм — за квітнеючае і стабільнае грамадства. Прынцыпова нацыяналізм адрозніваецца толькі ад чыстага лібералізму з яго тэзаю пра перавагу інтарэсаў і правоў асобы. Такая ідэалогія нарадзілася на пустых прасторах Новага Свету ў галовах эмігрантаў, адарваных ад сваіх каранёў. Такія грамады не адчувалі сябе адным народам. Але сёння і ў краінах Новага Свету няма чыстага лібералізму. Сацыяльная абарона сірых і ўбогіх, студэнтаў і пенсіянераў за акіянам часта далёка пераўзыходзіць нормы Старога Свету.

Але прафесар Шэйфер заўважыў не ўсе рысы нацыяналізму. Я мушу вярнуцца да верша Уладзіміра Караткевіча «Трызненне мужыцкага Брэйгеля», тры радкі з якога вынесены ў эпіграф. Гэты верш наш вялікі паэт напісаў у 1959 годзе і прысвяціў яго мастацтвазнаўцу Н. М. Молевай, чый аповед пра творчасць нідэрландскага мастака XVI стагоддзя ён чуў. Пітэр Брэйгель Старэйшы маляваў не лубочныя карціны квітнеючай краіны, а яркія бязлітасныя сцэны п'янага разгулу разбагацелых бюргераў. Ствараў сімвалічныя сцэны разумовага і духоўнага заняпаду сытага грамадства, калі маляваў сляпых, што ідуць чарадой, трымаючыся адзін за аднаго, і падаюць у прорву ўслед за сляпым павадыром. Ці выяўляючы карціну карчомнага разгулу на фоне падзення ў мора крылатага юнака, які схацеў узняцца да сонца.

Дзякуючы таленту нідэрландскага мастака мы можам праілюстраваць розніцу паміж звычайным патрыятызмам і патрыятызмам нацыяналіста. Любоў да радзімы ўласцівая, як пісаў Ф. Скарына, і звярам лясным, якія ведаюць «норы свае». Патрыятызм нацыяналіста — гэта любоў з расплюшчанымі вачыма. Нацыяналіст бачыць хібы свайго народа і беды сваёй краіны і змагаецца за іх выпраўленне. Хто скажа, ці не стала Галандыя квітнеючай краінай дзякуючы бязлітасным карцінам Пітэра Брэйгеля Старэйшага, празванага мужыцкім?

Падводзячы вынікі гэтаму кароткаму аналізу (бо можна яшчэ шмат што сказаць пра страты, якія панёс беларускі народ з-за адсутнасці ў яго нацыяналізму), я хачу падкрэсліць, што ў сённяшняй Беларусі нацыяналістычнымі павінны быць дэмакратычныя партыі ўсяго палітычнага спектру. Мець беларусацэнтрычныя праграмы і лідэраў без ухілу на Захад ці Усход. Толькі шчырая адданасць інтарэсам свайго народа адкрые шлях да электаральнай перамогі. А не карыслівыя спробы стварыць кіруемую апазіцыю



АПАЗІЦЫЯ

# ПАЛІТЫЧНЫ СПРЫНТ

Вольга ХВОІН

**Кіраўнік руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч ініцыюе Кангрэс праеўрапейскіх сілаў. Прапановы да ўдзелу будуць разасланыя тысячам асоб, большасць з якіх так ці інакш удзельнічалі ў прэзідэнцкай кампаніі 2006 года. Але каардынатар Еўрапейскай кааліцыі Мікола Статкевіч сцвярджае, што ідэя кангрэса першапачаткова належала яму. У супрацьвагу Мілінкевічу Еўрапейская кааліцыя правядзе свой Кангрэс 21 чэрвеня.**


Фота Юрыя Дзядзінкіна
Аляксандр Мілінкевіч і Віктар Карніенка

Для Аляксандра Мілінкевіча, які збіраецца ўдзельнічаць у наступных прэзідэнцкіх выбарах, Кангрэс праеўрапейскіх сілаў — спосаб данесці свае ідэі да магчымых аднадумцаў, а заадно і ацаніць іх колькасць. Паводле рыторыкі кіраўніцтва руху, ініцыятыва кангрэсу — калі не спроба пацягнуць на сябе коўдру, то прынамсі выразны жэст пра намер самастойна працаваць унутры краіны. Прапанову Еўрапейскай кааліцыі правесці Кангрэс праеўрапейскіх сілаў раней падтрымалі партыі АГП, БНФ, БХД і рух «За свабоду». Але, як цытуе словы Міколы Статкевіча інтэрнэт-рэсурс «Беларускі партызан», рух «За свабоду» тармазіў працу на працягу двух месяцаў і ўрэшце выступіў з гэтай ініцыятывай аўтаномна.

Намеснік кіраўніка руху «За свабоду» і фактычна яго ідэйны натхняльнік Віктар Карніенка патлумачыў, што ў перамовах з Міколам Статкевічам рух удзельнічаў, бо гэта адпавядала яго канцэпцыі. Але палітыкі не паразумеліся ў часе правядзення мерапрыемства: Еўрапейская кааліцыя абрала чэрвень, рух «За свабоду» — сёлетнюю восень. «Мы хочам запрасіць еўрапейскіх палітыкаў, у чэрвені выбары ў еўрапейскі парламент, і ім будзе не да нас, — тлумачыць палітык. — Мы нікога не выкідаем з працы, хай і Статкевіч удзельнічае. Але ні з якім АДСам змагацца не збіраемся, калі ёсць сумесныя погляды, то будзем працаваць разам. Калі не, то зробім тое, што лічым неабходным без аглядкі на АДС». Кіраўніцтва руху ўскладае на кангрэс функцыю мабілізацыі «ўсіх прыхільнікаў еўрапейскага выбару Беларусі».

«Чым хутчэй будзе адбывацца працэс еўраінтэграцыі, тым лепш, — падкрэслівае Карніенка. — Мы не думаем, што некаму атрымаецца выкарыстаць Еўропу, каб змяніць рэжым. Ёсць заявы некаторых палітыкаў кшталту таго, што Радаслаў Сікорскі будзе несці асабістую адказнасць за тое, што адбываецца ў Беларусі, гучаць абвінавачванні ў братанні са злачынным рэжымам. Гэта смешна. У Еўропы тут ёсць свае інтарэсы — эканамічныя, геапалітычныя. Калі б ЕС бачыў, што праз паўтара-два гады АДС могуць адолець рэжым Лукашэнкі, то можа б і пачакалі, але відавочна, што гэтага не адбудзецца, таму палітыкі і шукаюць тут сураэмоўцу. І мы б хацелі ўплываць на гэты працэс, бо ёсць шэраг пытанняў, у якіх мы падтрымліваем афіцыйны Мінск. Напрыклад, памяншэнне коштаў візаў для грамадзян Беларусі».

Разам з тым Карніенка зазначыў, што цяпер нагоды размаўляць з уладамі няма, і рух не збіраецца будаваць нейкія штучныя адносіны, а тым больш станавіцца кішэннай арганізацыяй улады. «Па некаторых прынцыповых пытаннях мы будзем трымацца сваёй пазіцыі. Але заявамі нічога не выправіш, трэба канкрэтныя дзеянні, канкрэтныя тэхналогіі», — падкрэслівае намеснік Мілінкевіча.

Праўда, прызнаецца, што толькі «пэўная частка апазіцыі» гатовая пераарыентавацца з заяў і дэкларацый на фармат дзеянняў. «Дэмакратычныя сілы доўга працавалі на міжнародную супольнасць, а трэба працаваць на грамадзян. Мусіць быць масавая падтрымка людзей. Праз палітычныя спецэфекты дасягнуць пераменаў немагчыма», — упэўнены палітык.

Што тычыцца фармату кангрэса, то рух «За свабоду» збіраецца запрасіць на яго як мага больш людзей, але стаўка ў асноўным робіцца на прыхільнікаў руху. Перад кангрэсам кіраўніцтва арганізацыі збіраецца праехаць па рэгіёнах, правесці сходы на базе сваіх структур. Будзе адпаведны зварот да лідэраў палітычных партый, але «ніякія рашэнні іншых палітыкаў не спыняць гэты працэс».

Пасля сумеснай сустрэчы лідэраў апазіцыйных палітычных структур было прынята рашэнне правесці Кангрэс праеўрапейскіх сілаў 21 чэрвеня. Адна з галоўных задач для ўдзельнікаў кангрэсу — вылучыць адзінага кандыдата на прэзідэнцкія выбары. Кіраўнік руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч не будзе прымаць удзел у гэтым кангрэсе.

Каардынатар Еўрапейскай кааліцыі Мікола Статкевіч расказаў, што падчас гэтай сустрэчы ён запатрабаваў у прадстаўніка руху «За свабоду» патлумачыць, што азначае ініцыятыва кангрэсу на восень пад патранажам Мілінкевіча. «Нам адказалі, што не падтрымліваюць нашы ідэі, адмовіліся падтрымаць форму правядзення кангрэсу, калі кожная структура вылучае сваю дэлегацыю. Тады я папрасіў сысці прадстаўнікоў руху», — зазначыў Статкевіч. Пасля сыходу прадстаўнікоў руху, удзельнікі сустрэчы зацвердзілі парадак дня, прызначылі дату правядзення кангрэса — 21 чэрвеня. Свой выбар аргументавалі тым, што «няма чаго губляць час» і «невядома, што будзе адбывацца ў грамадстве і з грамадствам праз некалькі месяцаў».

На дадзены момант вядома, што на ўдзел у кангрэсе пагадзіліся БНФ, «Народная грамада», «Малады фронт», Партыя свабоды і прагрэсу, рух салідарнасці «Разам» пад кіраўніцтвам Вячаслава Сіўчыка. Аб'ядналая грамадзянская партыя і хрысціянскія дэмакраты папрасілі час для ўнутраных кансультацый. Дарэчы, калі дэлегацыя ад палітычнай структуры будзе налічваць больш за семдзесят чалавек, яна мае права вылучыць свайго прадстаўніка для абрання адзінага кандыдата.

НАПЯРЭДАДНІ

# КАМУНІСТЫ ХОЧУЦЬ РЭБРЭНДЫНГУ

Марыя КРУК

**Партыя камуністаў беларуская 23 мая правядзе пазачарговы з'езд, на якім будуць вырашаныя пытанні пра давер да кіраўніцтва партыі, а таксама пра магчымую змену яе назвы.**


Фота Юрыя Дзядзінкіна
Валерый Ухналёў і Сяргей Калякін

З'езд ПКБ адбудзецца ў будынку ДК Мінскага трактарнага заводу, адпаведны дазвол на арэнду памяшкання партыя атрымала з Мінгарвыканкаму. Пленум Цэнтральнага камітэта партыі прыняў рашэнне, што з'езд пройдзе ў два этапы: першы адбудзецца 23 мая, другі — сёлетняй восенню.

У парадку з'езду ПКБ два асноўныя пытанні: разгляд вотуму даверу да Цэнтральнага камітэту партыі і асабіста да старшыні Сяргея Калякіна, а таксама рэфармаванне самой партыі, і ў прыватнасці змена яе назвы. Над рэфармаваннем партыі ўжо некалькі месяцаў працуюць тры камісіі. Сакратар ЦК ПКБ Валерый Ухналёў узначальвае групу па выпрацоўцы зменаў у статут. Камісія на чале з лідэрам ПКБ Сяргеем Калякіным распрацоўвае праект пазіцыі па пытаннях эканамічнага крызісу. Група, якой кіруе сакратар партыі Алена Скрыган, рыхтуе пакет прапаноў для з'езда па змене назвы партыі.

Дарэчы, за старую назву прагаласавалі толькі 9 з 49 сяброў ЦК. Цяпер кіраўніцтва партыі прапануе шэсць варыянтаў новай назвы для ПКБ: «Беларуская партыя левых» (БПЛ), Партыя «Новы курс», Партыя дэмакратыі і справядлівасці (ПДС), Партыя «Радзіма», Партыя «Справядлівасці і народаўладдзя» (ПСН), Партыя «Справядлівы свет». Калі з'езд вырашыць змяніць назву партыі, то з шасці варыянтаў абяруць тры, якія і будуць прапанаваныя на галасаванне на другім этапе з'езду. Між іншым, адной з магчымых падставаў для змены назвы партыі з'яўляецца варыянт, калі Сяргей Калякін надумае балатавацца на наступных прэзідэнцкіх выбарах. Адпаведна, палітычная платформа з больш сучаснай назвай, якая не асацыюецца з камуністычнай ідэалогіяй, будзе да месца.

На з'ездзе разгледзяць праект новага статуту, які дазваляе стварэць унутры партыі асобныя платформы. Будзе нададзена ўвага і Антыкрызіснай платформе Аб'ядналых дэмсілаў.

З'езд пройдзе ў закрытым рэжыме, журналістаў, як і гасцей, кіраўніцтва ПКБ вырашыла не запрашаць. Сакратар ЦК ПКБ Валерый Ухналёў адзначае, што гэта звязана найперш з пытаннямі, якія выносяцца на разгляд. «Будзе абмяркоўвацца сітуацыя з унутраным станам партыі, яе перайменаваннем. Выносіць гэта ў шырокія колы не мае сэнсу. Гэта не звязана з працай з насельніцтвам, знешнепартыйнымі справамі. Тут выключна ўнутрыпартыйныя пытанні і інтарэсы», — падкрэслівае Валерый Ухналёў. Сакратар ЦК лічыць, што перайменаванне партыі і разгляд вотуму даверу да яе кіраўніцтва — справы не надзвычайныя. «Дыскусія пра перайменаванне і рэфармаванне партыі вядзецца з мінулай восені, яна мае як сваіх прыхільнікаў, так і праціўнікаў. Разгледзець пытанне даверу да цяперашняга лідэра партыі Сяргея Калякіна вымусілі лісты ад партыйцаў, якія лічаць, што ён вядзе партыю «не туды». З'езд хаця і пазачарговы, але мае паўнамоцтвы перавыбараў. Таму, калі Калякіну выкажа недавер большасць дэлегатаў, будуць вылучаныя іншыя кандыдатуры на гэтую пасаду», — патлумачыў партыйны функцыянер. Валерый Ухналёў заявіў, што нічога не ведае наконт чутак пра тое, што ён сам з'яўляецца патэнцыйным кандыдатам на старшынства ў ПКБ, але разам з тым і не аспрэчыў магчымага лідэрства ў партыі: «Я ведаю настроі з'езда, не будзе ніякай змены кіраўніцтва. Калі ўзнікне такая патрэба, тады і будзем пра гэта гаварыць».

У працы з'езду возьмуць удзел 210 дэлегатаў — па 30 ад Мінска і кожнай з абласцей.

СПРАВА

# ПАПЕРА ЎСЁ СТРЫВАЕ, АЛЕ НЕ ЛЮДЗІ

Вольга ХВОІН
**23.35** Трылер «Начная вахта» (ЗША).
**23.55** Навіны.
**01.25** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Шальны анёл». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Дакументальны дэтэктыў».
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Вялікая розніца».
**22.10** Меладрама «Так яна знайшла мяне».
**00.05** «Наша Belarussia».
**00.35** Драма «Надзін».
**02.00** Нашы навіны.
**02.15** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Гаішнікі». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Дарагая перадача».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Уцёкі». Францыя, 1978 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Фільм «Зайздрасць багоў». Расія, 2000 г.

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Угон» (Расія). 3-я серыя.
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Час футболу.
**10.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.30** «Лабірынты: прывіды старасвецкай Лошыцы».
**12.00** Дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы-2» (Расія).
**12.45** Камедыйны серыял «Рака-мора» (Расія). Заключная серыя.
**13.40** Дакументальна-пазнавальны фільм «Буслы ракі Луангва» (Францыя).
**14.30** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Школа рамонту.
**16.00** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Усё аб бяспецы.
**19.20** Бітва экстрасэнсаў.
**20.30** Калыханка.
**20.50** Экспедыцыя.
**20.55** Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Свой - чужы» (Расія).
**22.35** Фантастычны крымінальны трылер «Лялячка» (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Карміліта».
**10.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2», 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Птушка шчасця Мікалая Гнацюка». Дакументальны фільм.
**12.20** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Пісьменнікі нашага дзяцінства». Дакументальны серыял.
**14.50** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.40** Фільм «Ніхто не заменіць цябе».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**21.20** Фільм «Туды, дзе жыве шчасце», 2006 г.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** Фільм «Не прывыкайце да цудаў».
**01.05** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Галоўны герой».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Іх норавы».
**10.50** «Шнур вакол свету».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Крывавы круг».
**12.10** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** «Ты не паверыш! Ньюс».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.35** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі...».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.50** Прэм'ера. «Мяса. Гісторыя ўсерасійскага зману».
**22.50** Гістарычная драма «Распуснік».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. «Гейм, сэт і матч». Часопіс.
**10.00** Вось дык так!!!
**10.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фінал.
**12.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 6-ы. Прамая трансляцыя.
**17.00** Веласпорт. "Тур Італіі". 19-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 6-ы. Прамая трансляцыя.
**20.30** Тэніс. «Гейм, сэт і матч». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**21.00** «Самыя моцныя людзі планеты». Гран-Пры суперсерый (Швецыя).
**22.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.00** Покер. Турнір Partouche (Францыя).
**00.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 6-ы.
**01.00** Тэніс. «Гейм, сэт і матч». Часопіс.
**01.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**02.00** Армрэстлінг. PAL/NAL.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**19.00** Праект "Будучыня".
**19.30** «Троіца», фільм-канцэрт.
**20.15** Рэпартэр (інфармацыйная праграма).
**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку).
**21.00** Аб'ектыў.
**21.15** Госць «Белсату».
**21.30** «Герой года», маст. фільм, 1986 г., Польшча.
**23.25** «Апошні сезон», серыял.
**00.15** Аб'ектыў.

## 30 МАЯ, СУБОТА

**06.15** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**06.45** Брытва Окама.
**07.10** Існасць.
**07.35** Дзень спорту.
**07.45** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**08.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.00** Навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**09.35** Здароўе.
**10.10** Шпілька.
**10.45** Ранішняя хваля.
**11.15** «Off Stage Life».
**11.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**12.00** Навіны.
**12.10** Прыгодніцкая камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынаў» (СССР).
**14.05** «У чаканні Мундыаля». Дзённік чэмпіянату свету па футболе-2010.
**14.30** «Будні чэмпіёнаў».
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**16.40** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**17.45** Відэафільм АТН «Верхнядзвінская адысея» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** Навіны.
**18.20** «Ваша лато».
**19.10** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Фантастычная трагікамедыя «Ніколі не размаўляйце з невядомым» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**22.10** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха». Вынікі Канскага кінафэсту. Фільм 1-ы.
**22.40** Фільм тыдня. Крымінальны трылер «Шчаслівы лік Слэвіна» (Германія - ЗША).
**00.45** Уласны персонай.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.35** «Здароўе».
**10.20** «Смак».
**11.00** Прэм'ера. «Аляксей Лявонаў. У бездані на краі».
**12.00** Фільм «Мадлен».
**13.35** Тэлечасопіс «Саюз».
**14.05** «Кінаметры вайны».»Цяжкасці лёгкага жанру. Пяцёрка адважных».
**14.35** «Пяцёрка адважных». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Вялікая палітыка.
**16.50** Тэорыя неверагоднасці. «Таемныя знакі зямлі».
**17.35** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.30** Фільм «Распаленая субота».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Пражэктарпэрысхілтан».
**21.45** «Што? Дзе? Калі?».
**23.10** Фільм «Гадзіла».

**07.10** «Анфас».
**07.25** «Гарачы лёд».
**07.50** «Вовачка - 4». Камедыйны серыял. Заключная серыя.
**08.20** Фільм «Казкі старога чараўніка». СССР, 1984 г. 2-я серыя.
**09.30** «Я - вандроўца».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.00** Фільм «Адзін і без зброі». СССР, 1984 г.
**14.25** «Дарагая перадача».
**15.05** «Рэальны спорт».
**15.20** «Ваенная таямніца».
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Нашы рэкорды».
**18.10** «Top Gear. Руская версія».
**19.00** «Ля параднага пад'езду».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Скала Малхоланд». ЗША, 1996 г.
**22.15** Канцэрт М.Задорнава.
**00.05** Фільм «Хронікі звычайнага вар'яцтва». Германія-Чэхія-Славакія, 2005 г.
**01.55** Фільм «Вар'яцтва». ЗША, 1998 г.

**07.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
**08.10** Серыял для дзяцей «Філ з будучыні» (ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**10.05** Таемны густ.
**10.35** Жансавет.
**11.05** Школа рамонту.
**12.05** Невытлумачальна, але факт.
**13.05** «Лабірынты: Камянец - Падольскі».
**13.30** Запал па культуры. Ток-шоў.
**14.10** Жаночая ліга.
**14.40** Прэм'ера. Прыгодніцкі фільм для ўсёй сям'і «Робін Гуд» (Вялікабрытанія).
**15.40** Дэтэктыў «Я - целаахоўнік» (Расія). 1 - 4 серыі.
**18.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) - «Днепр» Прамая трансляцыя.
**20.55** Жаночая ліга.
**21.25** Прэм'ера. Крымінальная драма «3 таго боку неба» (ЗША - Мексіка).
**23.25** Казанова.

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.15** Дэтэктыў «Шах каралеве дыяментаў».
**08.50** «Суботнік».
**09.30** «Ранішняя пошта».
**10.05** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Пакой смеху».
**12.30** «Сталіца лялечнай імперыі». Дакументальны фільм.
**13.00** Тэлесерыял «Каменская».
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Залатая міна».
**17.00** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Суботні вечар».
**21.30** Мастацкі фільм «А я кахаю жанатага». 2008 г.
**23.25** Мастацкі фільм «Грахі нашы». 2008 г.
**01.05** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Казкі Бажэнава».
**08.45** Мультфільм.
**08.55** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Асоба небяспечны!».
**14.05** Дэтэктыў «Галоўны доказ».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Жаночы погляд».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**19.55** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**21.00** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**22.55** Рамантычная камедыя «Прадаўшчыца».
**00.45** Мастацкі камедыйны фільм «Клеркі-2».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. «Гейм, сэт і матч». Часопіс.
**10.00** Веласпорт. "Тур Італіі". 19-ы этап.
**11.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 6-ы.
**12.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 7-ы. Прамая трансляцыя.
**17.30** Веласпорт. "Тур Італіі". 20-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 7-ы. Прамая трансляцыя.
**21.30** Тэніс. «Гейм, сэт і матч». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**22.00** Снукер. Сусветная серыя ў Ірландыі. Дзень 2-і.
**00.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 7-ы.
**01.00** Тэніс. «Гейм, сэт і матч». Часопіс.
**01.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір World Max (Японія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**18.45** «Усяго найлепшага!», дак. фільм, 2008 г., Венгрыя–Аўстрыя–Германія.
**20.05** На колах.
**20.35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў.
**21.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дарога праз стэпы між аазісаў», дак. фільм, 2007 г., Японія.
**22.05** Еўропа сёння.
**22.35** Суботні сеанс: «Кошт яе раману», трымценнік, 1996 г., ЗША.
**00.00** Аб'ектыў.

## 31 МАЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.40** Сямейны серыял «Мая мама - ветэрынар» (Германія). 1-я серыя.
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05, 15.30** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.05** Культурныя людзі.
**10.35** У свеце матораў.
**11.10** Дакументальны фільм «Масфільм». Невядомая версія» (Украіна).
**12.15** Фільм-катастрофа «Павозка» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Nota Bene.
**16.05** Фантастычны серыял «Паверхня» (ЗША).
**17.55** Суперлато.
**18.55** «Зорныя танцы». Закл. праграма.
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха». Вынікі Канскага кінафэсту. Фільм 2-і.
**22.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.10** Камедыя «Калі б я быў багаты» (Францыя).

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** «Разумніцы і разумнікі».
**12.20** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.45** «Зваротны адлік». «Армія Краёва. Апошні бой».
**13.15** «Авіяслалам. Чэмпіянат свету».
**14.15** Фільм «Ты ў мяне адна».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Мікалай Валуеў. Прыгажун і пачвара».
**17.30** Камедыя «Нявернасць».
**19.10** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Новыя галасы Беларусі».
**23.40** Прэм'ера. Фільм «Усё жыццё перад вачамі».
**01.20** «Камедзі Клаб».

### СТВ

**06.15** «Праверана на сабе».
**07.00** «Турысты». Камедыйны серыял.
**07.50** Фільм «Уцёкі». Францыя, 1978 г.
**09.30** «Добры дзень, доктар!».
**10.00** Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Аўтапанарама».
**13.00** Фільм «Алё, Варшава!». СССР, 1971 г.
**14.30** «Дарагая передача».
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Уваскрэсенне класікі».
**17.55** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Аднойчы ў Галівудзе». ЗША, 2008 г.
**22.25** «Спартыўны тыдзень».
**22.45** «Міжнародны турнір па настольным тэнісе. Про-тур. Stag Belarus Open - 2009».
**00.10** «Агенцтва «Залатая куля». Серыял.

### ЛАД

**08.10** Дабравест.
**08.35** Мір вашай хаце.
**08.50** Бухта капітанаў.
**09.30** Наша пяцёрачка.
**10.00** Мультфільм.
**10.10** Кінааповесць «Да мяне, Мухтар!».
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.05** Сезон ля дачы.
**12.50** Пасоўванне+.
**13.05** Слова пісьменніка.
**13.35** Рамантычная камедыя «Наступны прыпынак - краіна цудаў» (ЗША).
**15.25** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці».
**17.50** Футбол. Кубак Беларусі. Фінал. Прамая трансляцыя.
**20.10** Вялікае сэрца.
**20.40** Тэлебарометр.
**21.00** Экспедыцыя.
**21.35** Крымінальная камедыя «Маўчы ў анучку» (Вялікабрытанія).
**23.30** «Правы чалавека».
**23.45** Свая музыка.
**00.15** Пасоўванне+.

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Фільм «У глухмені».
**08.40** Фільм «Патрыятычная камедыя».
**10.30** «Смехапанарама» Яўгенія Петрасяна.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** Свята мастацкай гімнастыкі.
**13.05** Тэлесерыял «Каменская».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Савецкая імперыя. Радзіма-маці». Дакументальны фільм .
**15.10** Музычны фільм «Бедная крошка», 2006 г.
**16.30** «Танцы з Зоркамі». Сезон-2009.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.30** Святочны канцэрт да Дня абароны дзяцей «Дарослыя і дзеці».
**22.15** КВЗ. Першая ліга. 1\8 фіналу.
**00.05** Дабрачынны канцэрт "Падаруй жыццё».
**01.30** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Прафесія-рэпарцёр».
**11.20** «Авіятары».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.15** Эксцэнтрычная камедыя «Забойны футбол».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Барацьба за ўласнасць».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.00** «Галоўны герой».
**22.10** Эратычная меладрама «Святы дым».
**00.15** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ЗША. Суперпоул.
**10.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» у Іспаніі (Валенсія). Warm-Up. Прамая трансляцыя.
**11.00** Аўтагонкі. Міжнародная формула Мастэрс (Валенсія, Іспанія). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**12.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 8-ы. Прамая трансляцыя.
**13.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» у Іспаніі (Валенсія). Заезд 1-ы. Прамая трансляцыя.
**14.45** Формула-2. Чэмпіянат свету ў Іспаніі (Валенсія). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**15.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» у Іспаніі (Валенсія). Заезд 2-і. Прамая трансляцыя.
**16.45** Веласпорт. «Тур Італіі». 21-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 8-ы. Прамая трансляцыя.
**21.30** Тэніс. «Гейм, сэт і матч». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**22.00** Матаспорт па выходных.
**22.15** Суперспорт. Чэмпіянат свету ў ЗША. Прамая трансляцыя.
**23.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Total KO.
**00.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ЗША. Заезд 1-ы.
**00.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ЗША. Заезд 2-і. Прамая трансляцыя.
**01.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Дзень 8-ы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Прэс-экспрэс.
**18.15** «Ранча», серыял.
**19.05** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.15** «Белы тэрор», дак. фільм, 2006 г., Францыя.
**20.10** Форум (ток-шоу).
**21.00** Аб'ектыў.
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Кім быў Кірыла Тураўскі?» (спазнаваўчая праграма).
**21.25** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма).
**21.50** Фільматэка майстроў: «Знакамітасць», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**23.45** «Дарога на Вільню», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**00.05** Аб'ектыў.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ______ (по реестру ф. 11)
№ ______ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ______________ руб.
______________ (сумма прописью)

Кому Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ______________

Адрес ______________ (почтовый индекс и подробный адрес)

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик
Пеня
Кассир Всего

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик
Пеня
Кассир Всего



КІНО

# ЗОРНЫ ШЛЯХ

Іван БІЧ

**У пракат выходзіць фільм, зняты па самаму папулярнаму ў гісторыі чалавецтва серыялу. Мова, натуральна, пра «Зорны шлях» («Star Trek»).**

«Апраменьвай мяне, Скоці!», «Супраціў не мае сэнсу!», «Прывітанне па-вулканску» — гэтыя выразы мала што кажуць нашым людзям, асабліва тым, хто вырас у часы СССР. Між тым, ва ўсім свеце гэта знаёмыя кожнаму афарызмы.

У гэтым кантэксце серыял «Зорны шлях» — не толькі самы вядомы серыял у гісторыі, аднак яшчэ і своеасаблівы помнік «халоднай вайне». Кіраўніцтва СССР не захацела, каб савецкія грамадзяне пазнаёміліся з прыгодамі капітана Джэймса Кірка і экіпажу яго касмічнага карабля. З пункту гледжання тагачаснага палітычнага моманту, гэта, магчыма, было правільна. З пункту гледжання ўдзелу СССР у глабальным культурным і не толькі працэсе — фатальная памылка.

«Star Trek» паўплываў на шмат галінаў жыцця. Напрыклад, пытанне: «Ці глядзіце вы «Зорны шлях?», некаторыя фірмы ўключылі ў спіс пытанняў для кандыдатаў на працу. Было даказана, што аўдыторыя фільму — людзі з большым творчым патэнцыялам.

Усё пачалося ў 1964 годзе, калі былы ваенны лётчык Юджын Родэнберы напісаў сцэнар навукова-фантастычнага серыялу і прадаў яго каналу NCB. Фабула серыялу вельмі простая: у другой палове XXIII стагоддзя касмічны карабель «Enterprise NCC–1701» пад кіраўніцтвам капітана Джэймса Кірка даследуе новыя сусветы. У кожнай серыі ён сустракаецца з прадстаўніком нейкай іншай цывілізацыі.

Ідэя Юджына не выклікала асаблівага энтузіязму ў дырэкцыі, аднак невялікія грошы на праект выдалі. Першыя выпускі «Зорнага шляху» мелі нізкі рэйтынг папулярнасці. Ад закрыцця дзецішча Родэнберы ратавалі толькі пратэсты групы моладзі, якой падабаўся жанр навуковай фантастыкі. Было вырашана «Зорны шлях» у эфіры пакінуць, аднак паставіць у сетцы праграм на позні час. У такім фармаце серыял існаваў да 1969 года, калі яго закрылі за нізкі рэйтынг.

Здавалася б, на гэтым усё і закончыцца. Аднак у наступныя гады свет стаў сведкам каласальнага росту цікавасці да прадукту Родэнберы. Узнікла нават цэлая моладзевая субкультура — трэкеры (англ.: trekker).

Натуральна, босы Галівуду не спалі ў шапку. У 1973 годзе выйшаў новы серыял. Пасля «Зорны шлях» у розных варыяцыях з'яўляўся на экранах у 1978, 1987, 1993, 1995 і 2001 гадах. Апошні серыял, які называўся «Enterprise», закончыўся ў 2005 годзе. У рамках серыялаў былі зняты 716 эпізодаў. Разам яны ішлі 23 сезоны. Паралельна пабачылі свет адзінаццаць асобных фільмаў. У пракаце было таксама сем фільмаў-пародый на «Зорны шлях».

Акрамя сталай прысутнасці на тэлебачанні, «Зорны шлях» атакуе кніжны рынак. З 1969 года выдадзена 300 літаратурных твораў, героямі якіх сталі астранаўты «Enterprise NCC–1701». І гэта не ўлічваючы коміксаў. Паступова дайшла чарга і да камп'ютарных гульняў. Ужо выйшла сорак гульняў, якія будуюцца на сюжэце «Star Trek». Увогуле, продаж сувеніраў, кніг, коміксаў прыносіць уладальнікам 4 мільярда долараў штогод.

Жыхары горада Рыверсайд у штаце Айова заявілі, што Джэймс Кірк нарадзіўся менавіта тут. Яны нават штогод праводзяць фестываль у гонар свайго земляка. У Лас-Вегасе адкрыты парк атракцыёнаў, прысвечаны персанажам «Зорнага шляху».

**Большасць навукоўцаў, аналізуючы падтэкст серыялу, лічаць, што «Зорны шлях» дзіўным чынам рэфлектаваў над грамадска-палітычнымі працэсамі канца 1960–70-х**

Застаецца спытаць, чаму менавіта «Зорны шлях»? У чым сакрэт такога поспеху? Возьмем пад увагу таксама той факт, што бюджэт у першага серыяла быў катастрафічна малы. Ніякіх спецэфектаў у фільме няма. Іншапланецяне выглядаюць знешне падобнымі на звычайных людзей, толькі апранутыя яны вельмі экзатычна.

Праўда, трэба адзначыць цудоўна прадуманыя сюжэты, які нават сёння ўражваюць смеласцю думкі. Дарэчы, героі «Зорнага шляху» маюць мабільныя тэлефоны — ніводны фантаст да Родэнберы не дадумаўся да таго, што тэлефонам могуць быць не патрэбныя дроты.

Таксама аўтарам удалося вybудаваць цікавы псіхалагічны трохкутнік: капітан Кірк і яго памочнік Містэр Споук канфліктуюць, а МакКой (яшчэ адзін персанаж) іранічна каментуе ход спрэчкі.

Большасць навукоўцаў, аналізуючы падтэкст серыялу, лічаць, што «Зорны шлях» дзіўным чынам рэфлектаваў над грамадска-палітычнымі працэсамі канца 1960–70-х. Мова пра моладзевую рэвалюцыю, якая змяніла культурныя, маральныя, этычныя ўстаноўкі. Родэнберы папросту агучыў лозунгі контркультуры. Стаўленне да праблем сексу, расізму, гвалту, нацыяналізму ў герояў вельмі прагрэсіўнае ў праекцыі на тыя часы.

Лічыцца, што менавіта ў «Зорным шляху» быў упершыню ў ЗША зняты пацалунак паміж прадстаўнікамі чорнай і белай расаў. Ухура, чарнаскурая гераіня, пацалавалася з белым астранаўтам (пазней, дарэчы, гэты эпізод NASA выкарыстоўвала ў рэкламным роліку, які заклікае чарнаскурых дзяўчат ісці ў касманаўтыку). Акрамя таго, тагачасных амерыканцаў вельмі шакіраваў факт, што Ухура займае пасаду афіцэра. Гэта была відавочная правакацыя супраць стэрэатыпаў аб грамадскіх функцыях жанчыны. Вупі Голдберг — славутая актрыса Галівуду, была актывісткай трэкераў, — кажа, што менавіта вобраз Ухуры прымусіў яе ставіць больш значныя задачы ў жыцці і дабівацца іх.

Цікавая гісторыя атрымалася з Паўлам Чэхавым — яшчэ адным персанажам «Зорнага шляху». Родэнберы, які ўвёў яго ў карціну, быццам смяяўся з тагачаснай антысавецкай прапаганды на Захадзе, якая малявала ўсіх савецкіх каварнымі і прымітыўнымі варварамі.

Не дзіўна, што славуты змагар за грамадзянскія правы Марцін Лютэр Кінг дазваляў сваім дзецям глядзець выключна гэты серыял. Аматарамі фільму былі Айзік Азімаў, Фрэнк Сінатра. Цяперашні прэзідэнт ЗША Барак Абама таксама заўзяты фанат філасофіі фільму.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

За месяц да ўкраінска-ватыканскай сустрэчы візіт у Ватыкан, у гэтую цытадэль каталіцкай рэлігіі, нанёс іншы лідэр славянскага свету — Аляксандр Лукашэнка. У выпадку з беларускім кіраўніком візіт меў хутчэй рэкламны характар — дзейнасць Бенядзікта XVI знаходзіцца пад татальнай увагай усёй сусветнай прэсы, у той час як пра Лукашэнку, акрамя мянушкі «апошні дыктатар», у свеце нічога не вядома.

**«Глобалист» (Расія)**

Мы можам прапанаваць нашым новым суседзям вярнуцца ў фармат адзінай дзяржавы. Уступайце ў Расійскую Федэрацыю ў якасці федэральных акругаў. Вось, напрыклад, Беларусь. Мінская восьмая федэральная акруга. І там будуць унутраныя кошты Расіі, і не трэба будзе перад Брусселем прыніжацца, Маскве хлусіць. Аднак не хоча гэтага Лукашэнка. Ён, сялянскі сын, хоча быць гаспадаром, атаманам, бацькам.

**«Независимая газета» (Расія)**

«Не ўяўляю сабе Лукашэнку, які вядзе блог.

**«Маркетинг и Консалтинг» (Расія)**

Беларуская дэлегацыя ўразіла ўсіх гасцей конкурсу («Еўрабачанне») бясплатнай раздачай марозіва і глазураваных сыркоў у першыя дні працы (па чутках, пасланцы Аляксандра Лукашэнкі прывезлі ў «Алімпійскі» каля 16 тысяч порцый марозіва і 90 тысяч сыркоў). Аднак гэта акцыя першага месца выканаўцу, які рэкламаваўся падобным чынам, не прынесла.

**«Деловой Петербург» (Расія)**

Зараз Беларусь, якая знаходзіцца ў дастаткова складанай сітуацыі ва ўмовах крызісу, гандлюе сабой, сваёй падтрымкай, прапануючы сябе ў якасці патэнцыйнага сябра і партнёра не толькі Расіі і Еўропе, аднак і Кітаю. Робіцца гэта дастаткова добра. У гэтым сэнсе я не бачу ні асаблівых правалаў, ні асаблівых поспехаў у нашых адносінах зараз і ў будучым. І тут больш чым у іншых краінах справядлівая думка пра тое, што кожны наступны лідэр можа аказацца больш складаным і менш прамаскоўскім. У гэтым вельмі сур'ёзная праблема. З Лукашэнкам вельмі складана, аднак у перспектыве будзе яшчэ складаней.

**Сайт партыі «Союз правых сил» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### САУДАЎСКАЯ АРАВІЯ. КОНКУРС ЖАНОЧАЙ МАРАЛЬНАСЦІ

Адна з галоўных тэм, якія абмяркоўваюцца ў Саудаўскай Аравіі, — хто стане першай міс краю? Аднак абранне першай прыгажуні адбываецца ў Саудаўскай Аравіі ў трохі іншым фармаце, чым на Захадзе. Тут перамагае не вонкавая, а ўнутраная прыгажосць. Такім чынам, 200 кандыдаткам на званне першай прыгажуні прапанавана прадэманстраваць, наколькі яны паважаюць бацьку і маці. Хто праявіць больш павагі, той і пераможа. Прычым праяўленне павагі мае быць не абстрактным, а канкрэтным. Сябры журы наведваюць сем'і кандыдатак і фіксуюць іх ступень павагі і любові да дарослых. Лепшыя ў гэтай катэгорыі стануць удзельнікамі фінальнага шоу, на якім і будзе вызначаны пераможца. У тым, што абранне першай міс мае ў Аравіі падобную формулу, няма нічога дзіўнага: дэфіле па подыуму і дэманстрацыя строяў — галоўныя элементы кожнага конкурсу прыгажосці — у Аравіі немагчымыя. Жанчынам забаронена выходзіць на публіку без паранджы.

**Па матэрыялах «Arabia» (Польшча)**

### АЗЕРБАЙДЖАН: НАШЫ ГОРЫ НЕ ПРОЙДУЦЬ



Кожны, напэўна, чуў пра тое, што Арменія патрабавала ўвесці супраць Баку санкцыі за парушэнне правіл «Еўрабачання». Падчас працэдуры галасавання ў Азербайджане з экранаў было дзіўным чынам прыбрана прозвішча армянскіх удзельнікаў конкурсу. Аднак на самой справе выкарыстанне музычнага конкурсу ў палітычных мэтах армянамі і азербайджанцамі пачалося значна раней. Яшчэ да пачатку конкурсу журналістам дэманстраваліся прэзентацыйныя ролікі кожнай краіны. Праглядзеўшы ролік Арменіі, азербайджанскі журналіст узняў гвалт. Ён пабачыў у ролiку манумент «Мы — нашы горы». Справа ў тым, што знаходзіцца помнік на тэрыторыі Нагорнага Карабаху, які фармальна ёсць тэрыторыяй Азербайджану. У Баку пачалася сапраўдная грамадзянская кампанія за тое, каб армяне ролік перарабілі. Арганізатары «Еўрабачання» пагадзіліся. У ролiку, які дэманстраваўся падчас конкурсу, згаданага помніка не было. Хаця проста так армяне не здаліся. Журналісты, якія ў прымам эфіры абвяшчалі вынікі галасавання ў Арменіі, сталі на фоне выявы помніка «Мы — нашы горы»

**Па матэрыялах day.az (Азербайджан)**

### КЮРАСАО. АЎТАНОМІЯ НЕ ПРАДАЕЦЦА

15 мая на карыбскім востраве Кюрасао адбыўся рэферэндум. Жыхары адмовілі былым каланізатарам з Галандыі ў вяртанні кантролю над такімі сферамі, як суд, адукацыя, адміністрацыя. Каб зразумець такі дзіўны факт, трэба згадаць, што з 1954 года Кюрасао карыстаецца ўнутранай аўтаноміяй у складзе Каралеўства Нідэрланды. Пытанні знешняй палітыкі і абароны застаюцца ў кампетэнцыі Амстэрдаму. У сваю чаргу, Кюрасао ўваходзіць у рэгіянальнае аўтаномнае аб'яднанне Нідэрландскія Антыльскія астравы. Тыя астравы маюць каласальную знешнюю запазычанасць — 1,7 мільярда еўра. Цэнтр гатовы ўзяць на сябе даўгі, аднак толькі ў абмен на абмежаванне аўтаноміі. Менавіта гэтае пытанне — пагаджацца або не на продаж праў аўтаноміі — было вынесена на рэферэндум. Большасць прагаласавала супраць. На думку прыхільнікаў незалежнасці, у прынцыпе Амстэрдам, як даваў, так і далей працягваў бы даваць субсідыі Кюрасао. Папросту ў справу нечакана ўмяшаліся ЗША. Да Венесуэлы, дзе правіць заўзяты антыамерыканскі палітык Чавес, усяго 57 кіламетраў. У гэтым кантэксце востраў-курорт Кюрасао ператвараецца ў важны геапалітычны чыннік, і нейкая аўтаномія тубыльцаў для інтарэсаў ЗША тут толькі перашкода.

**Па матэрыялах «NRS Handelsblat» (Нідэрланды)**



### ВЕНЕСУЭЛА. ШТО БУДУЕ ЧАВЕС?

Эксперты актыўна абмяркоўваюць апошнія крокі Уга Чавеса. Мова пра серыю ўказаў пра нацыяналізацыю прадпрыемстваў у розных галінах. Вясна яшчэ не закончылася, аднак пад кантроль дзяржавы за гэты сезон ужо амаль цалкам перайшлі ўсе электрычныя кампаніі, тэлекамунікацыі, фінансавы сектар, вытворчасць цэменту. Сам Чавес звязвае рэформы з новай фазай будаўніцтва сацыялізму, у які быццам бы ўступіла краіна. Яна афіцыйна называецца «Трэці этап сацыялізму». Па словах Чавеса, калі этап будзе паспяховым, Венесуэла пераплюне Савецкі Саюз. Апазіцыя, між тым, звязвае бум нацыяналізацыі з эканамічнымі цяжкасцямі рэжыму. Зараз кошт на нафту складае 40 долараў за барэль, хаця бюджэт быў сфармаваны з лічбы 60 долараў. Застаецца дадаць, што знешні доўг краіны апошнім часам вырас да 7 мільярдаў долараў.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

ЦІКАВА

# РЫФМАПЛЁТ ЯЕ ВЯЛІКАСЦІ

*Алег ПЯТРОЎ*

**Елізавета II прызначыла чарговага паэта, які будзе ўслаўляць яе ў вершах. Упершыню за тры стагоддзі існавання гэтай дзіўнай пасады галоўным паэтам каралеўства стане жанчына.**



Адзін з самых моцных аргументаў прыхільнікаў пераходу Брытаніі на рэспубліканскі дзяржаўны лад — наяўнасць пры каралеўскім двары абсалютна дзіўных, непатрэбных пасад кшталту лакеяў, адказных за развядзенне лебедзяў, карэтнікаў і г. д. Экзотыка экзотыкай, а заробкі тым людзям плацяць з дзяржаўнага бюджэту, які, як вядома, фармуецца з падаткаў простых грамадзян. «Замест утрымання лакея, лепш пабудаваць школу або шпіталь», — кажуць рэспубліканцы.

Не будзем каментаваць палеміку паміж прыхільнікамі і праціўнікамі манархіі. Проста адзначым, што сярод пасад пры каралеўскім двары ёсць і Poet Laureate. Прасцей кажучы — афіцыйны паэт. Ягоныя функцыі — услаўляць манарха і сяброў каралеўскай сям'і ў вершах, перш за ўсё падчас усякіх важных падзей — дня народзін, вяселля, падпісання дыпламатычных дамоў, візітаў.

Традыцыя прысутнасці пры каралеўскім двары свайго паэта існуе ў Вялікабрытаніі з XIV стагоддзя. Лічыцца, што ідэя імпартавана з французскай Аквітаніі, дзе была моцна развітая культура менестрэляў. Да канца XVII стагоддзя пасада Poet Laureate не мела фармальнага статуса. Некаторыя каралі мелі паэтаў, іншыя мала цікавіліся мастацтвам складання рыфмаў. У 1670 годзе Poet Laureate зрабіўся сталым інстытутам. Прыкладна кожных 10–15 гадоў манарх прызначае новага паэта. Усяго за 340 гадоў іх было 22.




Цікава, што культура мецэнацтва сваіх паэтаў вельмі пашыраная ў Вялікабрытаніі. Напрыклад, свайго афіцыйнага паэта мае сталіца Шатландыі Эдынбург. Яго называюць Макар. У адміністрацыі Уэльса існуе такая пасада, як Нацыянальны паэт Уэльсу.

З брытанскіх выспаў практыка пашырылася на брытанскія калоніі, якія з часам атрымалі незалежнасць. Так існуе свой Poet Laureate ў канадскім парламенце. Дарэчы, падчас выбару паэта дзейнічае прынцып: адзін тэрмін пасаду займае англамоўны паэт, наступны — франкамоўны. З 1937 года Poet Laureate працуе пры амерыканскім Кангрэсе і атрымлівае заробак — 35 тысяч долараў на год. У Новай Зеландыі Poet Laureate прызначаецца дырэкцыяй Нацыянальнай бібліятэкі.

Цікава, што пасада Poet Laureate існавала і ў фашысцкай Германіі. Галоўным паэтам нацыстаў быў Ханс Йохст. Ён быў прызначаны Poet Laureate ў 1935 годзе і заставаўся на гэтай пасадзе да канца вайны. Пачынаў свой творчы шлях Йохст, як не дзіўна, як прыхільнік экспрэсіянізму (звычайна ў гэтым стылі пісалі паэты левых поглядаў). У 1928 годзе ён уступіў у створаны ідэолагам нацызму Альфрэдам Розенбергам Саюз за нямецкую культуру. У 1932-м Ханс стаў сябрам Нацыянал-сацыялістычнай

Сярод пасад пры каралеўскім двары ёсць і Poet Laureate. Працей кажучы — афіцыйны паэт. Ягоныя функцыі — услаўляць манарха і сяброў каралеўскай сям'і ў вершах

партыі. Менавіта ў год прыходу Гітлера да ўлады ён апублікаваў п'есу «Schlageter». Герой п'есы — нямецкі салдат, які трапляе ў французскі палон падчас акупацыі французамі левага берагу Рэйну ў пачатку 1920-х.

Дзякуючы падтрымцы фашыстаў п'еса мела вялікі поспех. 15 тэатраў па ўсёй Германіі паставілі на сваіх сцэнах «Schlageter». Цікава, што пазней, таксама па загаду Гітлера, п'есу забаранілі. Твор быў занадта антыфранцузскім, а сапсаваць адносіны з Парыжам на той час не ўваходзіла ў планы нацыстаў.

Йохст служыў фашыстам верай і праўдаю. Літаратар нават патрабаваў, каб славутага пісьменніка Томаса Мана, які крытыкаваў рэжым, адправілі ў канцлагер. На глебе агульных поглядаў паэт пасябраваў з Генрыхам Гімлерам і лічыўся ў нацысцкіх колах ягоным чалавекам.

Натуральна, Ханса чакала суперкар'ера: ён стаў старшынёй дэпартаменту, які адказваў за літаратуру, і нават акадэмікам. Гітлер асабіста ўнёс яго ў спіс шасці нямецкіх літаратараў, якіх нельга была прызываць на службу ў войска. Йохста, якому патрэбны быў матэрыял для твораў, пускалі на самыя сакрэтныя аб'екты Германіі, самыя зачыненыя сустрэчы. Напрыклад, пісьменнік прысутнічаў на сходзе кіраўніцтва СС, якое напярэдадні пачатку аперацыі Барбароса абмяркоўвала планы знішчэння савецкіх грамадзян.

Пасля вайны Йохст быў асуджаны на тры гады прымусовых работ. Пасля амністыі ён ціха жыў на сваёй віле і памёр у 1978 годзе. Да канца жыцця ён паспеў выдаць яшчэ пару зборнікаў вершаў.

Аднак, думаецца, новы брытанскі Poet Laureate — куды больш цікавая фігура, чым Йохст.

Кэрал Ан Дафі, якая нарадзілася ў 1950 годзе, калі стала Poet Laureate, разбурыла шэраг стэрэатыпаў, звязаных з пасадай афіцыйнага паэта. Кэрал — першая жанчына, першая шатландка на гэтай пасадзе, першы афіцыйны паэт каталіцкага веравызнання. У дадатак, Кэрал — першы афіцыйны паэт-лесбіянка. Нарэшце, яна першы афіцыйны паэт, які сапраўды прызнаны чытацкай аўдыторыяй. Знаўцы літаратуры лічаць яе лепшым брытанскім паэтам сучаснасці.

Застаецца дадаць, што за сваю працу Кэрал будзе атрымліваць прыкладна 5300 фунтаў на год плюс 600 пляшак віна шэры. Менавіта даваць паэтам заробак віном патрабуе стары закон XVII стагоддзя. Куды Кэрал падзене алкаголь, невядома. Што тычыцца грошай, то, са слоў новага Poet Laureate, большасць сумы пойдзе ў фонд падтрымкі брытанскай паэзіі. Так што на гэты конт прыхільнікі рэспубліканскага ладу і сацыяльнага бюджэту могуць быць спакойнымі.

ВЫБАРЫ

# ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ ЕЎРАСКЕПТЫКАЎ

Алег НОВІКАЎ




**На чэрвеньскіх выбарах у Еўрапейскі парламент праціўнікі еўрапейскай інтэграцыі першы раз у гісторыі будуць ісці пад дахам аднай партыі.**

Колькі існуе еўрапейская інтэграцыя, столькі ёй устаўляюць палкі ў колы яе праціўнікі, гэтак званыя еўраскептыкі. У гісторыі Еўрасаюза не было яшчэ такіх выбараў, па выніках якіх у парламент не патрапілі б дэпутаты, што выступаюць за роспуск гэтага самага парламента, або, як мінімум, за скарачэнне яго кампетэнцыі.

Не аказаліся выключэннем і папярэднія выбары 2004 года. Па іх выніках у Еўрапейскі парламент трапілі 34 дэпутаты, якія рабілі свае кампаніі на антыеўрапейскіх лозунгах. Яны сфармавалі фракцыю «Незалежнасць і дэмакратыя». Сваёй галоўнай мэтай сябры фракцыі лічаць супраціў працэсу прыняцця еўрапейскай канстытуцыі.

Трэба адзначыць, што «Незалежнасць і дэмакратыя» — не адзіная антыеўрапейская групоўка ў Брусэлі. Заклікі супраць ЕС часам гучаць і ад прадстаўнікоў фракцыі «Саюз за Еўропу нацый», якая аб'ядноўвае сяброў ультраправых партый, прадстаўленых у Еўрапарламенце. Яны бачаць у аб'яднанні Еўропы пагрозу нацыянальнай ідэнтычнасці.

Нарэшце, не вельмі паважаюць працэс інтэграцыі і парламентарыі ад групоўкі «Аб'яднаныя еўрапейскія левыя — Паўночныя левыя Зялёныя». Апошнія крытыкуюць ЕС за непразрыстыя правілы гульні. Калі ў нацыянальных дзяржавах — сябрах ЕС кіраўнікоў абіраюць адкрытым галасаваннем, то ў самім ЕС гэта працэдура закрытая.

Так ці інакш, выбары Еўрапарламента ў чэрвені 2008-га стануць пераломнымі ў лёсе руху еўраскептыкаў. Упершыню ў гісторыі яны будуць выступаць не асобна, а разам, адзіным спісам пад дахам адной партыі.

Партыя называецца «Libertas». «Libertas» нарадзілася ў Ірландыі ў 2003 годзе як грамадская арганізацыя. Яе бацькам-заснавальнікам стаў мільянер Дэклан Джэймс Генлі, які зарабіў грошы на продажы расійскага алюмінію. Выданне «European Business magazine» ацэньвае яго капітал у 300 мільёнаў еўра.

Па-сутнасці, нараджэнне «Libertas» як сапраўды масавага руху адбылося прыкладна год таму. Генлі і каманда правялі вельмі моцную кампанію супраць праекту Еўрапейскай канстытуцыі, які быў вынесены на рэферэндум. 12 чэрвеня 2008 года 53 працэнта ірландцаў прагаласавалі супраць праекту. Лічбы выклікалі шок у Брусэлі і рост амбіцый у Генлі.

Поспех натхніў яго на ідэю стварэння агульнаеўрапейскага руху еўраскептыкаў. Хутка мільянер зрабіў сапраўдны еўрапейскі тур у пошуках аднадумцаў. І, як не дзіўна, 1 мая 2009 года ў Рыме адбылася ўстаноўчая канферэнцыя еўрапейскай партыі «Libertas». На цяперашні момант секцыі партыі створаныя ў 27 краінах ЕС. На выбары ў Еўрапарламент ад «Libertas» балатуецца 400 кандыдатаў.

Партыя мае кантакты з амерыканскай арганізацыяй «The Heritage Foundation», якая лічыцца экспертным цэнтрам партыі рэспубліканцаў. Генлі мае кантакты з Вацлавам Клаўсам (цяперашні чэшскі прэзідэнт, вядомы сваімі антыеўрапейскімі поглядамі), які паабяцаў аказаць «Libertas» падтрымку.

Праўда, трэба прызнаць, што структура руху не да канца ясная. Існуе як мінімум дзве мадэлі арганізацыі. Ёсць створаныя філіялы «Libertas». Паралельна дзейнічаюць партыі, якія пагадзіліся сфармаваць з «Libertas» агульны спіс, каб змагацца за «новы дэмакратычны Еўрасаюз» (галоўная мэта партыі).

Цяперашні Еўрасаюз, на думку стваральнікаў «Libertas», сышоў з правільнага шляху і заблукаў. Каб павярнуць ЕС да людзей, трэба перш за ўсё адмовіцца ад праекту канстытуцыі, якая «яшчэ больш павялічвае прорву паміж брусельскай элітай і народам Еўропы».

Праграмныя ўстаноўкі «Libertas», між тым, вельмі мала адпавядаюць праграмам і канкрэтным учынкам людзей, якія прадстаўляюць рух на месцах.

Трэба перш за ўсё адзначыць, што самі партыі, якія падтрымліваюць праект Генлі на месцах, абсалютна розныя. Сярод саюзнікаў «Libertas» — Партыя пенсіянераў Латвіі, Партыя французскіх паляўнічых і рыбакоў, італьянскі рух за аўтаномію рэгіёнаў, польская Партыя сялян, левая партыя праціўнікаў незалежнасці Каталоніі «Грамадзяне» і г. д. У кожнай партыі свае матывы супрацьстаяць еўрапейскай інтэграцыі. Найбольш экзатычная тут грэкі, якія супраць ЕС, паколькі згаданая структура будуецца на прынцыпах свецкага гуманізму, а не праваслаўя. Дададзім, што брытанская секцыя «Libertas» увогуле выступае за выхад з ЕС. У дыскусіі брытанскіх еўраскептыкаў ідэя стварэння лепшага Еўрасаюза нават не абмяркоўваецца.

Такая дзіўная ідэйная салянка дае падставы падазраваць, што некаторыя палітыкі захацелі папросту скарыстацца грашыма Генлі, каб трошкі палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. Як палітычныя акцёры яны ў сваіх краінах — поўны нуль. За выключэннем хіба што Партыі паляўнічых і рыбакоў, кандыдат якой атрымаў на прэзідэнцкіх выбарах 2002 года ў першым туры 4,6 працэнтаў.

Што тычыцца сфармаваных апошнім часам секцый «Libertas», то яны ўяўляюць сабою хутчэй асабістыя праекты людзей, якія па розных прычынах апынуліся за бортам вялікай палітыкі. Лепшы прыклад — Польшча, дзе ініцыятыву стварэння «Libertas» узялі на сябе былыя сябры Лігі польскіх сямей. Польская «Libertas» не мае ніякай сацыяльнай базы, структураў на месцах і падтрымкі з боку касцёла. Парадаксальна, аднак папуліцкі праект Дэклана Генлі хутчэй разбурае стары лагер еўраскептыкаў, памяншаючы іх шанцы трапіць у Еўрапейскі парламент.




## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДЖААНА ЛАМЛІ



Брытанская актрыса, якая вядомая дзякуючы ролі дзяўчыны Джэймса Бонда, выратавала гонар брытанскага войска. Яна дамаглася таго, што ветэраны-гуркі атрымаюць права на пражыванне ў Вялікабрытаніі. Гуркамі называюць непальцаў, якія служаць у брытанскім войску. Першыя батальёны гуркаў брытанцы пачалі фармаваць яшчэ ў 1815 годзе пасля няўдалай спробы захапіць Непал. Уражаныя мужнасцю тубыльцаў, брытанцы дабіліся таго, каб у мірнай дамове быў пункт, які дазваляў непальцам служыць у арміі Яе Вялікасці. З тых часоў у Непале штогод праводзіцца вярбоўка салдат (цяперашні конкурс — 160 чалавек на месца). Гуркі ўсе 200 гадоў служылі на самых важных і небяспечных участках фронту. Праблема ў тым, што, паводле закону, яны застаюцца грамадзянамі Непалу і пасля службы павінны ехаць дахаты. З улікам розніцы ва ўзроўні жыцця шматлікія ветэраны-гуркі хацелі б застацца ў Вялікабрытаніі, аднак гэта не аргумент для дэпартаменту па пытаннях мігрантаў. Бог ведае, чым усё скончылася б для трох тысяч гуркаў (менавіта столькім пагражае дэпартацыя), калі б не Джаана. Яна арганізавала кампанію ў іх абарону і дамаглася сенсацыйнай перамогі. Практычна ўсе фракцыі парламенту падтрымалі праект, які надае ветэранам-гуркам права мець пажыццёвую брытанскую візу.

### РАХАТ АЛІЕЎ



Былы зяць прэзідэнта Казахстана, які збег у Вену, лічыцца галоўным ворагам Назарбаева, таму што доўгі час быў сябрам бліжэйшага атачэння прэзідэнта і сабраў на яго салідны кампрамат. Кампрамат ён час ад часу злівае ў сеціва. Падобную дзейнасць высока ацанілі на радзіме Аліева: яго ўжо завочна прыгаварылі да 40 гадоў турмы. Аднак галоўным ударам па рэжыму павінна была стаць кніга «Хросны цесць», якую Аліеў доўга рэкламаваў. Уся краіна чакала скандальнага фаліянта. Выходзілі нават фальшывыя «хросныя цесці», дзе пісаліся самыя неверагодныя рэчы (кшталту таго, што кожны вышэйшы казахскі чыноўнік перад тым, як паступіць на службу, павінен быў пацалаваць нагу прэзідэнта). І вось нарэшце ў кнігарнях з'явіўся сапраўдны «Хросны цесць». На 540 старонках Аліеў апісвае, як функцыянуе пабудаваная Назарбаевым сістэма. Яе спадарожнікі — карупцыя, продаж нацыянальнага багацця, перавод грошай на персанальныя рахункі за мяжу. Аднак самы вясёлы блок прысвечаны праекту «Суперхан», які быццам распрацаваны адміністрацыяй Назарбаева. Яго сутнасць — перадача ўлады ў краіне ў 2035 годзе па дынастычнай лініі. Новым кіраўніком Казахстана, па гэтаму плану, павінен стаць Султан Назарбаеў, які нарадзіўся ў 2005 годзе. Дарэчы, ён быў зачаты ў прабірцы і народжаны ад малодшай жонкі Назарбаева Асель (міс Казахстан 1999 года). Афіцыйная Астана змест кнігі неяк не каментуе.

### ДЖЫДЖЫ БЕКАЛІ



Прадпрымальнік, папуліцкі палітык, уладальнік папулярнага румынскага футбольнага клубу «Сцяуа» — зараз самы вялікі прыхільнік еўрапейскай інтэграцыі ў Румыніі. Менавіта дзякуючы Еўрасаюзу і выбарам у яго парламент, якія прызначаны на чэрвень, ён можа выйсці з турмы, куды трапіў з красавіка. Трапіў ён туды з-за суда Лінча, які Джыджы са сваімі целаахоўнікамі ўчыніў над групай хуліганаў, якія скралі ягоную машыну. Праз нейкі час Бекалі арыштавалі і, нягледзячы на пратэсты фанатаў «Сцяуа», асудзілі. Аднак ужо праз 10 дзён яго наведаў лідэр радыкальнай нацыяналістычнай партыі «Вялікая Румынія» і прапанаваў месца ў сумесным спісе на выбарах у Еўрапарламент. Джыджы таксама мае сваю партыю «Новая генерацыя», якая, як і «Вялікая Румынія», знаходзіцца ў другой лізе румынскай палітыкі. Аднак кааліцыя дае ім шанец на выбарах. Зараз адвакаты Бекалі часова выцягнулі яго з турмы, каб ён мог весці выбарчую кампанію. Дзякуючы папулярнасці ягонага клуба і скандальнай славе картэль «Новая генерацыя — Вялікая Румынія» адразу апынуўся ў фокусе СМІ. Цяпер усе чакаюць, куды адправіцца Джыджы гэтым летам: у турму або ў Еўрапарламент. Застаецца дадаць, што раней Бекалі люта ненавідзеў партыю «Вялікая Румынія». Лідэры апошняй плацілі той жа манетай, называючы Джыджы «пасол д'ябла».

▸ ФЭСТ

# САЮЗ ДЭРУНА І ДРАНІКА

Алесь ГІНЗБУРГ

**З 3 па 18 мая ў Кіеве зноў сустракалі «Беларускую вясну» — «самы вялікі ва Усходняй Еўропе фестываль нецэнзурнай беларускай культуры». У трэці раз за апошнія гады на сталіцу Украіны ды іншыя яе гарады высадзіўся масавы дэсант беларускіх творцаў.**

«Беларуская вясна–2009» — не проста самы вялікі фестываль. Гэта самы гнуткі па фармаце і самы схільны да (сама)развіцця праект па прапагандзе беларускай культуры за межамі нашай сталіцы.

Ён уяўляе сабой шэраг разнапланавых акцый, пакліканых паказаць украінцам цікавосткі сучаснай беларускай культуры. Фестываль пачынаўся ў 2006 годзе як стыхійна-эмацыйная акцыя салідарнасці з беларусамі, што выйшлі на Плошчу, і меў выразную сацыяльна-грамадскую афарбоўку. Але чым далей, тым «культурней»: з кожным годам арганізатары спрабуюць усё больш пераводзіць выключна палітычную цікавасць да Беларусі на літаратурна-мастацкія рэйкі.

Арганізатары БВ — ініцыятыва «Салідарнасць» — суполка ўкраінскіх беларусаў і неабыякавых да Беларусі ўкраінцаў, якія імкнуцца развіваць беларуска-ўкраінскія сувязі, а таксама творчая ініцыятыва «Беларускі дэсант» — аб'яднанне зацікаўленых беларускай культурай маладых людзей, гатовых прасоўваць яе ва Украіне. Накіраванасць думкі і ідэалогіі ўсіх дзячат і хлопцаў, аб'яднаных ініцыятывай, — агульна-ліберальная. Сярод іх шмат «хіпоўствуючай» моладзі. Запрашаючы госцяў з Беларусі, яны арыентуюцца найперш на сваё ўпадабанні і густы, і, магчыма, таму «Беларуская вясна» — гэта заўсёды нестандартна і цікава.

Так, часты госць фестывалю — этна-гурт «Джамбімбум», які спалучае беларускі фальклор з музычнымі матывамі ўсяго свету. Літаратурным VIP-госцем БВ стаў пісьменнік Уладзімір Арлоў, ён выступіў у Кіеве ў тандэме з пісьменнікам Аляксандрам Ірванцом, і ў Львове ў тандэме з паэткай Мар'янай Саўкай, пра беларускае мастацтва ў Кіеве сёлета меркавалі па персанальнай выставе Алеся Пушкіна, перформансах «Свабоднага тэатру», дакументальным фільме Віктара Дашука «Каралеўства дохлых мышаў», мультымедыя-роліках часопіса «34».

Самай забаўнай падзеяй стаў ужо традыцыйны забег у лыжах па асфальце Хрышчацку, а самай скандальнай — беларуска-украінскі слэм-рэванш на адкрытай пляцоўцы Андрэеўскага спуску (нагадаем: год таму 12 красавіка зборная паэтаў Беларусі нанесла разгром украінцам на іх тэрыторыі). 18 мая ў межах паэтычнага фестывалю «Кіеўскія лаўры» адбыўся круглы стол «Цэнзура ў СМІ і кнігавыдавецтве: Беларусь—Украіна».

Алесь Пушкін зрабіў на украінцаў моцнае ўражанне. Гэта для нас яго перформансы, карціны, выступы даўно вядомыя — карнавальны фон тутэйшай абсурднай рэчаіснасці, а ў Кіеве выстава «Рукі беларусаў» стала культурным шокам. Тон быў зададзены прысвечаным Алесю дакументальным фільмам «Беларускі вальс», паказаным на вернісажы.

Уладзімір Арлоў сабраў аншлаг у Кіеве. Прэзентацыйная зала моднай кнігарні «Є» каля Залатых варот была забітая пад завязку. «Вечарына ў Кіеве выйшла больш пафаснай, а ў Львове больш камернай, — дзеліцца Арлоў уражаннямі. — І Сашко Ірванец, і Мар'яна Саўка — літаратары, блізка знаёмыя з беларускай літаратурай, выступалі як мадэратары сустрэчаў. І калі ў Кіеве яшчэ паступалі пытанні кшталту: «Ці жыве Беларусь?», «Ці даводзілася вам калі-небудзь, як Бродскаму, адчуваць сорам за сваю нацыянальнасць?», то ў Львове размова круцілася выключна каля літаратуры. Гэта з удзячнасцю адзначала публіка».

Арлоў і Ірванец на правах старэйшых патронаў завіталі 15 мая на Андрэеўскі спуск, каб падтрымаць беларускую і украінскую нацыянальныя зборныя па слэме падчас спаборніцтваў: «Падчас імпрэзы ўсіх частавалі «спраўжнімі ўкраінскімі дэрунамі» і «сапраўднымі беларускімі дранікамі» — з абсалютна аднолькавых талерак, — расказвае Арлоў. — Не ведаю, дэрун ці дранік гэта быў, але мне яго ўранілі на калашыну светлых нагавіцаў. Так што ад маладой паэзіі на мне засталася незмывальная пляма». Уладзімір Арлоў шчыра прывітаў паэтаў, што абаранялі на слэме гонар Беларусі — Уладзя Лянкевіча, Валярыну Куставу, Анку Упалу, Віктара Жыбуля, Веру Бурлак і Сяргея Прылуцкага (Пістончыка). Аляксандр Ірванец заклікаў супернікаў да братэрства і міру вершам з канцоўкай: «Абдымемся ж, як бульбаш з хахлом».

На думку Арлова, беларусы выступілі больш чым вартасна, але ўкраінская публіка незаслужана іх засудзіла. Сёлета рэванш атрымаўся ва ўкраінцаў напоўніцу. Беларусь прайграла з разгромным лікам.

Зрэшты, перамога не была адзінай мэтай усіх, хто сабраўся на беларуска-ўкраінскі слэм. Прыхаванай мэтай была асноўная ідэя фестывалю БВ — знаёмства з «нецэнзурнай беларускай культурай». «Нецэнзурнай» — слова, ужытае арганізатарамі свядома, для прыцягнення ўвагі кіеўскай публікі, нават у крызіс перасычанай культурнымі атракцыямі. Мелася на ўвазе «непадцэнзурнай» — намёк на поўную свабоду і магчымасць самарэалізацыі без боязі наступстваў, якую не першы год атрымліваюць беларускія музыкі, пісьменнікі і мастакі, выехаўшы за межы Беларусі. Пра тое, якім чынам у Беларусі і Украіне праяўляецца цэнзура, гаварылася падчас спецыяльнага «круглага стала». З беларускага боку разглядаўся выпадак з судом над «экстрэмісцкім» часопісам ARCHE. З украінскага падвяргалася крытыцы праца створанай пры Радзе Камісіі па маралі, якая між іншага прызнала парнаграфічным эратычны раман пісьменніка Алеся Ульяненка і забараніла яго продаж.

Яшчэ на мінулых выходных беларускую паэзію можна было пачуць на буйным міжнародным фестывалі паэзіі «Кіеўскія лаўры». Выступалі паэты Віктар Жыбуль, Вера Бурлак, Сяргей Прылуцкі, Марыя Мартысевіч, Дзмітры Строцаў.

Падчас жывога эфіру ўкраінскага радыё, куды беларускіх паэтаў запрасілі на нядзельную перадачу «Літаратурная кавярня», паступалі званкі слухачоў. «А што гэта ваш прэзідэнт габрэяў крыўдзіць, маўляў, Бабруйск развалілі?»; «А якія ў вас там сёння заробкі, і ці падскочылі камунальныя плацяжы?» — пыталіся некаторыя пенсіянеры ў паэта Віктара Жыбуля. Адна з мэтаў фестывалю «Беларуская вясна» — каб украінцам і без праблемы камунальных плацяжоў было пра што спытацца ў беларускіх творцаў. Падзеі не абмяжоўцца Кіевам: Львоў, Харкаў, Тэрнопаль, Данецк, Івана-Франкоўск — «першы вясновы гром» прагучаў і яшчэ будзе гучаць у канцы мая і чэрвені ў іншых гарадах Украіны.




Беларуская дыяспара падтрымлівае сваю зборную на слэме

Фата Цімура Ібраімава

## «Украінская літаратура — гэта найперш шоу»

**ВАЛЯРЫНА КУСТАВА далёка не дэбютантка ў беларускай паэзіі, але ўдзел у культурнай падзеі на тэрыторыі Украіны яна брала ўпершыню. Яе місіяй на міжнародным слэме было выступіць супраць харкаўскай паэткі-фотамадэлі Аліны Сваровскі. І наша Валярына з яе верай у «каханне-дранік» пераканаўча перамагла суперніцу! Паэтка дзеліцца з намі ўражаннямі ад сутыкнення з маладой украінскай літаратурай:**

— Уражанні ад пабачанага прыходзілі да мяне этапна. Калі мы стаялі і маральна ды фізічна разаграваліся (а ў Кіеве было не так цёпла!) перад слэмам, я магла назіраць, як рыхтуюцца да выступу ўкраінцы. Тыя танчылі, радасна віталі адзін аднаго, абдымаліся, былі камандай. І я ім па-добраму зайздросціла. Пыталася: чаму беларускія пісьменнікі не могуць быць такімі раскаванымі, адкрытымі, шчырымі, так цёпла прымаць адно аднаго? Цягам вечара я зразумела яшчэ адну рэч. Украінская літаратура — гэта найперш шоу. А шоу — гэта тое, чаго заўсёды катастрафічна бракавала беларускай літаратуры — апошнія два гады у нас ідзе навёрстванне ўпушчанага. Але для белліту шоу — гэта метад, сродак прыцягнуць увагу для больш важных рэчаў, а не самамэта, як гэта, мне здалося, ёсць ва Украіне.

Сярод супернікаў мне найбольш запомніліся паэты Дзмітро Лазуткін і Арцём Паляжака. Але калі ў перапынку паміж выступамі на пляцоўку выйшаў Сашко Ірванец — ува мне загаварыла ўсё маё класічнае выхаванне. Гэта глыбішча!

Пасля першага сутыкнення з актуальнай украінскай літаратурай я вынесла, што яна вельмі разнастайная і глыбокая. З'явілася жаданне купляць, пазычаць кніжкі і знаёміцца з ёй далей. Тым больш што, пачуўшы ўжывую ўкраінскую мову, я цяпер магу лягчэй чытаць тэксты па-ўкраінску.



Фота Іллі Гладштэйна

Уладзімір Арлоў у кіеўскай кнігарні «Є».




Капітаны беларускай і ўкраінскай зборнай Віктар Жыбуль і Дзмітро Лазуткін

Фата Цімура Ібраімава

## «Слэм быў сапраўдны»

АРЦЁМ ПАЛЯЖАКА — цяжкая артылерыя сёлетняй украінскай зборнай на слэме. Ён вызначае жанр, у якім працуе, так: «эстрадная паэзія». Марыць стаць тэлевядучым — ды вось ніхто не запрашае. Менавіта яго фінальны выступ з хітом, які адлюстроўвае саму сутнасць украінскіх сацыяльна-палітычных працэсаў («Каханая, зрабі мне імпічмэнт, а я зраблю табе дэфолт»), вывеў Украіну наперад у паэтычным слэм-рэваншы. Прайшло два дні. Папулярны паэт з цяжкасцю згадвае, як там усё было:

— Слэм быў сапраўдны. Не было адчування літаратурнага конкурсу, у які часта абарочваюцца ўкраінскія слэмы. На сапраўдным слэме можна выражаць пачуцці, крычаць, скокаць, падаць, цалавацца і піць піва — усё дазволена, і гэта нармальна. Усе мы — і ўкраінцы, і беларусы — малайцы. Тут дарэчы фраза: галоўнае — не перамога, а ўдзел. Часам выступаеш — і публіка заходзіцца ў авацыях, а табе самому некамфортна, не прэ цябе. На беларуска-ўкраінскім слэме камфортна было! Вельмі рады, што ў гэтым годзе, у адрозненне ад папярэдняга, я заваяваў давер тых, хто фармаваў каманду, і мяне запрасілі да ўдзелу ў міжнародным слэме. Я вельмі слаба ведаю беларускую літаратуру, каб з ёй пазнаёміцца, трэба да вас ехаць. Я мару выступаць па-за Украінай — найперш таму, што мне важна ведаць, як будзе ўспрымаць беларускі, рускі ці польскі слухач тое, што я раблю. Колькі ў маёй творчасці сапраўднага, а колькі — паверхневага.

ГАДАВІНА

# СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА — ПАЛЯК, ЛІТВІН…

Аляксей ХАДЫКА

**5 мая 2009 года музычны свет адзначыў 190-ю гадавіну з дня нараджэння выдатнага кампазітара, пачынальніка польскай нацыянальнай класічнай музыкі Станіслава Манюшкі (1819–1872).**







Дом у Вільні, дзе жыў Станіслаў Манюшка

**Так пачыналася музычна-мастацкая адукацыя будучага кампазітара: выхаванне маці, літургіі ў храмах, хатні тэатр у маёнтку роднага дзядзькі Юзэфа, нарэшце, народныя спевы**

У гэты дзень у Мінску ў Дзяржаўным музеі тэатральнай і музычнай культуры творы кампазітара гучалі ў выкананні трыо «Вытокі», а ў Навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук адчынілася экспазіцыя «Музычны свет Станіслава Манюшкі» — прадстаўлены 58 прыжыццёвых і пасмяротных выданняў яго твораў, зборнік вершаў Уладзіслава Сыракомлі «Бяседы і рытмы», асобныя творы якога прысвечаны Манюшцы. А таксама выданні музыказнаўцаў В. Рудзінскага, С. Невядомскага, З. Яхімецкага, біяграфічны нарыс пра С. Манюшку Б. Вільчынскага, а разам з імі — кнігі з аўтографамі сучасных беларускіх даследчыкаў творчасці Манюшкі — В. Скарабагатава, А. Мальдзіса, У. Мархеля і Б. Смольскага.

Вяршынямі творчасці Манюшкі сталі оперы: «Галька» (1858) — пастаўленая спачатку ў Вільні, а потым у Варшаве, і «Страшны двор» (1865), пра якія прысутны на імпрэзе ў бібліятэцы НАН пасол Польшчы Хенрык Літвін слушна казаў як пра творы, якія пакладзены ў аснову фармавання самасвядомасці сучаснай польскай нацыі. Але ж вытокі натхнення Манюшкі — у разнастайнай і шматаблічнай культуры народаў Рэчы Паспалітай, польскага і беларускага, літоўскага і ўкраінскага. Звязаны з Беларуссю кроўна і па духу, ён і яго спадчына заканамерна прыцягваюць увагу беларусаў і з’яўляюцца прадметамі нашага гонару.

Народны беларускі мелас, сялянская песенная паэзія ў перакaзе Яна Чачота, выбітныя вершы Адама Міцкевіча, тэксты Уладзіслава Сыракомлі — тая ўрадлівая культурная глеба, што лягла ў аснову творчых здзяйсненняў кампазітара. Тых, якія змянілі аблічча высокай музычнай культуры як польскіх, так і беларускіх земляў. Яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя ў салонах і залах шыкоўных магнацкіх палацаў, пад дахамі шляхецкіх сядзібаў гучалі пераважна творы італьянскіх, французскіх, нямецкіх музыкаў. За некалькі дзесяцігоддзяў на прафесійнай і хатняй сцэнах сваё годнае месца занялі мелодыі роднага краю. І дакладна падзяліць іх на польскія і беларускія — няўдзячная задача. Невыпадкова Рыгор Шырма, гаворачы пра напісаную ўжо ў Варшаве оперу Манюшкі «Фліс» («Плытагоны», 1858) адзначыў «такое багацце песенных і танцавальных народных інтанацый, што часам ствараецца ўражанне, што ты дзесьці пад Слуцкам ці каля Мінску прысутнічаеш на народным свяце».

І гэта заканамерна. Кампазітар нарадзіўся ў фальварку Убель Ігуменскага павета Мінскай губерні (сённяшні Чэрвеньскі раён) у шляхецкай сям’і, дзе бацька, Чэслаў Манюшка, сваяк мінскага жывапісца Валенція Ваньковіча, быў добрым графікам, а маці, Альжбета з Маджарскіх, выдатна грала на фартэпіяна. Так пачыналася музычна-мастацкая адукацыя будучага кампазітара: выхаванне маці, літургіі ў храмах, хатні тэатр у маёнтку роднага дзядзькі Юзэфа, нарэшце, народныя спевы, якія не мог не зафіксаваць слых таленавітага маладзёна. А далей былі заняткі разам з іншай музычнай славутасцю Беларусі, Фларыянам Міладоўскім, у Мінскай гімназіі ў класе музыканта і педагога Дамініка Стафановіча (да 1835 года), затым вучоба ў Вільні і, нарэшце, у рэктара Берлінскай пеўчай акадэміі К. Ф. Рунгенхагена. Там Манюшка шліфаваў сваё майстэрства дырыжора і кампазітара да 1840 года.

Першыя пастаноўкі Манюшкі — аднаактныя вадэвілі, «аперэткі» — нескладаныя, але прыязна ўспрынятыя публікай, якой падабаліся выкарыстаныя ў іх фальклорна-абрадавыя матывы вяселляў, дажынак, здзейсніліся ў Беларусі. У 1834 годзе ў Мінску пастаўлены «Канторскія служачыя». У 1841-м — у Гродне і ў 1843-м — у Мінску пастаўлены аднаактны жарт «Латэрэя» на лібрэта Корвін-Мілеўскага. А напрыканцы верасня 1841 года, сіламі аматараў, як і папярэднія п’есы, у Мінску выконвалася камічная опера «Рэкруцкі набор». Пастаўленая з нагоды прыезду ў Мінск новага генерал-губернатара Мірковіча, п’еса сталася першым эпізодам супрацоўніцтва кампазітара з маладым і яшчэ нязнаным пачынальнікам новай беларускай літаратуры Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам.

Па сутнасці, творчая садружнасць з ім Манюшкі распачала гісторыю беларускай оперы, бо разам яны падрыхтавалі чатыры аперэты. І надрукаваная ў 1846 годзе ў Вільні «Ідылія» («Сялянка»), якая ўбачыла сцэну 9 лютага 1852-га ў Мінску, а затым у Бабруйску, Слуцку, Нясвіжы — першы твор, у якім дзеючыя асобы-сяляне загаварылі па-беларуску побач з польскамоўнымі панамі.

Ажаніўшыся ў 1840 годзе з Аляксандрай Мюлер, Манюшка па 1858 год жыў у доме Мюлераў на Нямецкай вуліцы ў Вільні (зараз Вокечу, 26). Зарабляў граннем на аргане (дарэчы, перавезеным з Полацку) у касцёле св. Яна, а таксама арганізоўваў канцэрты, выкладаў, пісаў новую музыку. Пасля быў пераезд у Варшаву і трыумф «Галькі», фабула якой — гісторыя ашуканага кахання горскай дзяўчыны да паніча, на сцэне варшаўскай оперы ў 1858 годзе, і — народная музыка, народная мова — нараджэнне польскай нацыянальнай оперы. Затым — вяршыня «Страшнага двара» (1865), оперы хутчэй лёгкай і лірычнай па змесце, гісторыі кахання двух братоў, Стэфана і Збігнева, што спачатку пакляліся адмовіцца ад цікавасці да жанчын дзеля служэння айчыне, да дзвюх дзяўчат-сёстраў. Але глыбокая арыя Стэфана, у якой ён аплакваў смерць маці, успрымалася сімвалічна ў кантэксце паразы нацыянальна-вызвольнага паўстання 1863 года ў былой Рэчы Паспалітай, дазваляла захопленай публіцы прачытваць прыхаваны змест п’есы.

Зрабіўшыся заснавальнікам польскай оперы, ці адышоў Манюшка з беларускага далягляду? Пэўна, не.

Імкненне адштурхоўвацца ў творчасці ад нацыянальных асноў Манюшка праграмна дэклараваў у раннія гады, распачынаючы, сучаснай мовай, праект са шматзначнай назвай «Хатні спеўнік». Годам раней — да першага выпуску «Спеўніка», выдадзенага напрыканцы 1843-га, — Манюшка дэклараваў стаўленне і ацэнку музыкі, да якіх пачала імкнуцца «цывілізаваная Еўропа» на хвалі нацыянальнага адраджэння XIX стагоддзя: музыкі, як «не толькі як мовы, што перадае пэўную думку і пачуццё... але яшчэ як выявы пэўнай ментальнасці, нацыянальнага характару народаў».

Апрача амаль дваццаці опер і аперэт, трох балетаў, некалькіх кантат і мес ды іншых інструментальных і вакальных твораў, Манюшка стварыў амаль 400 песень. Цыкл «Песняў прынёманскіх вёсак», што ўвайшоў у «Хатнія спеўнікі», — узор яго супрацоўніцтва са старэйшым сучаснікам, сябрам віленскага студэнцкага таварыства філаматаў, Янам Чачотам, які, захоплены народным фальклорам, сабраў і выдаў у Вільні 6 зборнікаў народных «Сялянскіх песень» (1837–1846) у перакладзе на польскую мову і ў арыгінале. Некаторыя тэксты для стварэння музыкі Манюшка браў з друку, некаторыя па асабістай просьбе кампазітару даслаў у 1844 годзе сам Ян Чачот. Так, па словах выдатнага спевака і даследчыка Віктара Скарабагатава, Манюшка пераводзіў песні з фальклорнага стану ў акадэмічны. Каб потым рытміка і мелодыка народнай творчасці ўвасаблялася ў набытак высокіх музычных жанраў.

Таму, гледзячы з Беларусі, справядліва казаць, што Манюшка — кампазітар і польскі, і беларускі. Тым болей, што пакінуўшы радзіму, ён з ёю ніколі не спыняў сувязі. Прыязджаў адведаць бацьку і сваякоў, па-ранейшаму сябраваў з Дуніным-Марцінкевічам. Спрыяў выданню музычных твораў Ф. Міладоўскага, адукацыі мінскай скрыпачкі Б. Крыгер, сам навучаў мінскую піяністку І. Горват. У час з аднаго візітаў у Мінск у кастрычніку 1856 года на ўрачыстай вечарыне Дунін-Марцінкевіч вітаў музыку вершамі:

*«А трэці дудар меж намі ўзрос, ён нам братка,*
*Яму Мінская зямелька родненькая матка!...»*

Слынны даследчык беларускай культуры прафесар Адам Мальдзіс калісьці заўважыў, што Манюшка, выразіўшы нацыянальны дух польскага народа, заняў у яго культуры тое ж месца, што Сметана — у чэшскай, Глінка — у рускай. Але нарадзіўшыся ў Беларусі і чэрпаючы натхненне з народнай творчасці гэтай зямлі, зрабіў неацэнны ўнёсак і ў культуру Беларусі. На адкрыцці выставы ў бібліятэцы НАН Беларусі ён жа казаў пра неабходнасць аднаўлення сядзібы кампазітара ў Убелі, выгляд якой захаваўся на малюнку Напалеона Орды. А таксама рэстаўрацыі дзядзькавага палаца ў Смілавічах, дзе калісьці стаяў легендарны гадзіннік з музыкай. Быццам бы яго меладычны пераззвон, пачуты ў дзяцінстве, кампазітар узнавіў у паланезе трэцяга акту «Страшнага двара».

10 чэрвеня сярод падзей, прысвечаных святкаванню 190-годдзя славутага земляка, запрашаем наведаць канцэрт у камернай зале мінскай філармоніі — прэзентацыю кампакт-дыска «Новае неба Станіслава Манюшкі», запісанага ансамблем «Класік-Авангард» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава. Сярод адроджаных малавядомых старонак творчасці Манюшкі — аперэта «Латэрэя», якая, паводле паведамлення кампазітара сваякам, спадабалася мінчанам у пастаноўцы вандроўнай трупы немца Шмідткопфа яшчэ ў далёкім 1843 годзе. Манюшка вяртаецца…

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# НОЧ МУЗЕЯЎ–2009 У МІНСКУ

Аляксей ХАДЫКА

**16 мая ў пяты раз прайшла міжнародная акцыя «Ноч музеяў», у якой удзельнічала асноўная частка сталічных музейных устаноў. Нарадзілася ўзгаданая ініцыятыва намаганнямі супрацоўнікаў парыжскага Луўра. З 1999 года і па сённяшні дзень да яе далучылася больш за 2000 музеяў Еўропы.**



Перадаць усю панараму і багацце імпрэзаў, выставаў, перформансаў і канцэртаў, што адбываліся 16 мая ў музеях Беларусі, немагчыма, бо «Ноч музеяў» праходзіць у нас цяпер не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах. Нават калі гэта не зусім «ноч», а хутчэй «вечар», які заканчваецца самае позняе апоўначы, як у Нацыянальным мастацкім музеі.

Свята адбылося. Тысячы і тысячы мінчукоў, сярод якіх пераважала моладзь, былі згодныя не толькі адстаяць у чарзе да гадзіны часу, але і набыць уваходны квіток. Насуперак еўрапейскай завядзёнцы, у гэты вечар, адзначаны падвышаным энтузіязмам наведвальнікаў, нашы музеі спрабуюць трохі папраўіць сваё фінансавае становішча. Наведвальнікі, здаецца, не супраць.

Між тым, улічваючы паважаны ўзрост музейных установаў у Еўропе, — першыя звесткі пра калекцыянаванне сягаюць у антычныя часы, — недаравальна не прыгадаць пра беларускія музейныя даты. 425 год таму, у маі 1584 года, перасек межы радзімы, кіруючыся ў Нясвіж з паездкі ў Святую зямлю і Егіпет, нястомны збіральнік рарытэтаў і будаўнік захаванага да сёння Нясвіжскага замка Мікалай Хрыстафор Радзівіл Сіротка. Як і ягоны бацька, ён выкарыстоўваў кожную нагоду для папаўнення фамільных калекцый, ці не першых у Беларусі музейных збораў. І ўлічваючы тое, што сёлета для святкавання «Ночы музеяў» Нацыянальны мастацкі музей абраў тэматыку «Усходняя ноч», паказаўшы калекцыю злепкаў з егіпецкіх старажытнасцяў, можна было б святкаваць угодкі беларускай егіпталогіі, калі б толькі калекцыянер давёз з Егіпта муміі і старажытныя ўпрыгожанні. На жаль, яны зрабіліся здабычай хваляў узбуранага Міжземнага мора: збіральнік падпарадкаваўся волі забабонных маракоў, што верылі — муміі прыносяць няшчасці і губяць караблі.

Што ж, гадавіну з'яўлення ў публічнай калекцыі старажытнаегіпецкага саркафага давядзецца адкласці на наступны год, да 155 угодкаў заснавання Віленскага музея старажытнасцяў, куды археолаг і даследчык Канстанцін Тышкевіч ахвяраваў рарытэт з сямейнага збору ў Лагойску.

Галоўны мастацкі музей меў усе падставы абвясціць усходнюю тэматыку дамінантай сёлетніх святкаванняў: у адчыненым некалькі год таму новым корпусе пабач з калекцыямі старажытнага і сучаснага беларускага мастацтва сваё месца занялі экспанаты з Індыі, Кітая, іншых краін Усходу.

А святочную ноч упрыгожылі адмысловыя выставы. Чорнабелыя здымкі беларускага фатографа Вадзіма Качана «Людзі Егіпта» глядзеліся візітоўкай сучаснай мусульманскай краіны ў адмысловым музейным фотафармаце. Адсутнасць колеру ў гэтым выпадку — сродак узмацнення ўражання ад удала і выразна зафіксаваных мастаком імгненняў жыцця краю, апаленага гарачым афрыканскім сонцам. «Схаваная Японія» — калекцыя фотапоглядаў на іншую далёкую дзяржаву, прапанаваная японскім мастаком Яхагі Кідзюра. Старажытныя храмы і сучасная урбаністычная архітэктура, знакамітыя сады камянёў і краявіды — рэкі, вуліцы гарадоў, вобразы таямнічай і такой прыцягальнай краіны.

Карнавал пераўвасабленняў, імправізацый, перфомансаў панаваў тым часам у музейных залах, прываблваючы наведвальніка ўключыцца ў тэатралізаваныя гульні, якія разгарнуліся ва ўсіх залах музея. Тэатральна-музычная дзея «Калейдаскоп усходніх мрояў» давала, на думку арганізатараў, магчымасць дакрануцца да містычнай прыцягальнасці Усходу, што жыве ў сэрцах еўрапейцаў з часоў лорда Байрана. Госці знаёміліся з мастацтвам арыгамі — вырабам сімвалічных папяровых фігурак, і з творамі вытанчанай каліграфіі, «прымяралі» макіяж гейшы, назіралі, як гімнасткі ў экзатычных касцюмах узводзяць імправізаваную Вавілонскую вежу і як квітнее сімвалічная сакура. Вянчаў дзею відэапраектэкскурсія года «Шэдэўры ўсходняй калекцыі мастацкага музея».



Photo.ByMedia.Net

Квяцістыя фарбы ўсходніх краін стагоддзямі вабілі жыхароў былой Рэчы Паспалітай, тканыя ўзоры «на персідскі манер», «адамашкавыя» тканіны, прывезеныя купцамі, вызначалі адметны ўсходні каларыт касцюмаў старабеларускай шляхты, прадстаўнікі якой назіралі за дзеяй у музеі з палотнаў старасвецкіх партрэтаў. Ці выпадкова ўвасабляльнікамі першай заходнееўрапейскай моды на Усход у XVII стагоддзі зрабіліся менавіта нашы продкі, стаўшы прататыпамі «ўсходніх» мадэляў нават на карцінах Рэмбрандта? А XVIII стагоддзе дало з'яўленне фактычна нацыянальнага сімвалу з усходнім каларытам:

*«… той слуцкі знакаміты*
*Залататканы пояс, дзе як зліты*
*Дзве дэсані: бок добры ўвесь*
*у кветкі,*
*А адваротны — чорны,*
*нібы ў клеткі…»*

*Адам Міцкевіч, «Пан Тадэвуш»*

Слуцкія залаталітыя паясы, слава беларускага мастацтва, у гэтым годзе былі цівком святкавання, што працягвалася з нагоды яшчэ аднаго свята, Міжнароднага дня музеяў 18 мая — у Музеі старажытнабеларускай культуры Акадэміі навук на Сурганава 1, корпус 2. Установа, якая зберагае некалькі соцень старажытных абразоў і алтарных скульптур, змястоўныя этнаграфічныя і археалагічныя зборы, сёлета адзначыла 30 год свайго існавання. Прыгадаем імёны першых збіральнікаў гэтай скарбонкі нацыянальнай культуры — былой дырэктаркі Вольгі Церашчатавай, Элеаноры Вецер, Юрыя Хадыкі, і пажадаем іх пераемнікам дачакацца шчаслівага часу, калі музейная ўстанова нарэшце набудзе статус цалкам адчыненай, якую можна наведаць не толькі па папярэдняй дамове ў працоўны час тыдня. Што ж датычыцца «усходняй» разынкі, слуцкіх паясоў — то іх у экспазіцыі два, адзін з іх вярнуўся ў Беларусь з Англіі, падараваны збіральнікам «палонікі» і «літуанікі», нашчадкам па кудзелі князёў Мсціслаўскіх і Заслаўскіх прафесарам Анджэем Цеханавецкім.

Мастацкія і гістарычныя музеі — машына часу, быццам намаганнем чараўніка здольная пераносіць чалавека ў розныя эпохі ў мінулае. Нацыянальны музей гісторыі і культуры, буйнейшая ўстанова з калекцыяй каля 400 тысяч прадметаў, у святочны суботні вечар прапанаваў маршрут у апошнія дзесяцігоддзі СССР, рэтра-вечарыну «Мы з 60-х». Найбольш энергічныя ўдзельнікі свята, перамясціўшыся з іншага канца вуліцы Маркса ад Мастацкага музея, паспявалі ўліцца ў такі ж жвавы натоўп гасцей, якім гаспадары прапаноўвалі зірнуць у мінулае праз адмысловы фірменны атрыбут — папяровыя чырвоныя акуляры. Старэйшыя маглі з лёгкай настальгіяй узгадаць гады маладосці, сённяшняя моладзь — адчуць каларыт той эпохі.

Прынамсі лепшая заходняя і савецкая музыка 1960–1980-х гадоў, якая гучала з эстрады перад пляцоўкай у двары ў выкананні гуртоў «Даміно», «Федэрацыя», «Дзядзя Ваня», — і сёння выклікае цёплы водгук акордамі даўно знаёмых мелодый і спяваных паэтычных радкоў. Галоўныя ж падзеі разгорталіся ў залах — на выставе эпатажнага мастака Андрэя Смаляка «Невядомы Смаляк», дзе візіцёраў сустракалі піянеры ў гальштуках, прыгожыя мадэлі ў аднолькавых студэнтамі Акадэміі мастацтваў строях. Падалося, што, пазбаўленыя залішняй гульнявой экстравагантнасці, ранняя соц-артаўская работы Смаляка больш цэльныя і выразныя, чым творы з яго апошніх вернісажаў. Вобраз Купалы, як бы распнутага на фоне савецкага герба, патыліцы савецкіх лідэраў: Леніна, Сталіна, Хрушчова, Брэжнева, Гарбачова. Дух эпохі і з'яваў, што выклікалі пратэст, адштурхоўвалі мастака, але давалі тэмы для творчага сталення.

У кожнага часу — свае знакі, і вялікая іх каштоўнасць — у аўтэнтычнасці, бо гэта — гісторыя. Ці не самым унікальным экспанатам вечара стаўся вялізны чырвоны шаўковы вымпел з вышытымі золатам літарамі загаду Сталіна з нагоды вызвалення Мінска. Таксама дакумент і гісторыі, і стылю жыцця.

Пакуль цяжка сказаць, ці перадолелі музеі рэкорды наведванняў мінулых гадоў, калі ў адным Мастацкім прымалі каля 5 тысяч гасцей. Але можна сцвярджаць, што мы назіраем нараджэнне вартай традыцыі, калі беларусы, прыгадаўшы сваё еўрапейскае мінулае, разам з іншымі грамадзянамі кантынента імкнуцца дакрануцца да сваёй гісторыі, культуры, мастацтва. Хай бы так было не аднойчы на год.

АБ'ЯВА

Мінская гарадская арганізацыя ГА «ТБМ імя Ф. Скарыны»

**абвяшчае прыём у юрыдычную школу «Ведаем свае правы».**

Падчас заняткаў будуць разглежданы законы нашай краіны, якія датычаць функцыянавання беларускай мовы ў сферы адукацыі, культуры, рэкламы і інш. Таксама будуць праведзены практычныя заняткі.

Пачатак заняткаў 2 чэрвеня ў 19.00 на Румянцава, 13. Запісацца можна па тэл. **284-85-11** (з 16.00 да 19.00), ці па маб. **8-029-661-65-98** (Алена Анісім, старшыня Мінскай арганізацыі ТБМ).

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 22.05.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.